

Пашпарт марсіяніна ў мінскім музеі

СТАР. 5



Сімвалы Божага Нараджэння

СТАР. 10



Тэатр пра гледачоў

СТАР. 12

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 СНЕЖНЯ 2014 г. АЎТОРАК № 243 (27853) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ХОЧАЦЕ КУПЛЯЦЬ — КУПЛЯЙЦЕ

### У сітуацыі, што склалася на фінансавым і валютным рынках, не будуць стрымліваць імпарт тавараў

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладамі памочнікаў Прэзідэнта па Віцебскай і Гродзенскай абласцях Мікалая Шарстнёва і Уладзіміра Даманеўскага, паведамляе БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы пачаў размову з сітуацыі, што складваецца ў беларускай эканоміцы і ўплывае ў тым ліку на валютны рынак. Занепакоеныя тым, што нібыта абясцэньваецца беларуская валюта, грамадзяне імкнуцца хутчэй яе кудысьці ўкласці, скупляючы розныя тавары. «Дзякуй людзям, а то ў нас склады былі перагружаны пральнымі машынамі, бытавой тэхнікай, ЗВЧ-печамі, прасамі і іншым. Цяпер раптам яны спатрэбіліся і некаторым па пяць, па шэсць адзінак, — адзначыў Прэзідэнт. — Таму, з аднаго боку, дзякуй ім за тое, што яны разгрузілі склады. Тым самым, як гавораць фінансісты, мы звязалі вялікую масу грашовых сродкаў».

Але з іншага боку, кіраўніка дзяржавы здзіўляе, чаму людзі аддаюць перавагу імпарту па тых групах тавараў, якія вырабляюцца ў Беларусі. «Імпарт — ён адносна, можа, прыкладна супастаўны, хоць даражэйшы, з нашымі тэлевізарамі, пральнымі машынамі або ЗВЧ-печамі. Але калі заўтра, барані Божа, гэтая тэхніка выйдзе са строю, то яны ў дзесяць разоў даражэй заплацяць. Яшчэ і па тэрмінах, пакуль адрамантуюць, будуць праблемы, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта справа людзей: купляюць — няхай купляюць. Я сёння аддаў распараджэнне, асабліва ў Мінску, каб мы ні ў якім разе не стрымлівалі тавар па імпарце і каб на гэтым імпарце па-ранейшаму пасярэднікі і гандлёвыя работнікі не нажываліся».

«Калі гэта тавар, то ён павінен быць прададзены ў нас хаця б з рэнтабельнасцю 2-2,5 працэнта, пакуль не стабілізуюцца цэны. Але стрымліваць імпарт ні ў якім разе нельга. Навошта? Няхай на паліцах стаяць і тэлевізары, і прасы, айчынныя і імпартныя. Усё роўна імпарт будзе значна даражэйшы, чым айчыннае. Гэта таксама нам выгадна. Мы ніякіх дадатковых падаткаў пры гэтым не ўводзім», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

«Што датычыцца валютнага рынку, людзі ўжо зразумелі, што нельга такую высокую цану плаціць за долары і еўра. І гэта правільна. Урэшце, сапраўды лепш купіць нейкі тавар, чым купляць долар. Невядома, што заўтра з ім будзе», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як у сувязі з новаўвядзеннямі ўрада і Нацбанка складваецца сітуацыя ў Віцебскай і Гродзенскай абласцях. «Я паслухаю і іншых памочнікаў, каб уяўляць карціну не толькі з вуснаў губернатараў, але і з вашых вуснаў, якая сітуацыя на месцах. А яна ж не такая, як у Мінску. Гэта ў Мінску могуць бегаць, гвалтам крычаць, а на месцах можа быць іншая сітуацыя. Якая яна?» — запытаў беларускі лідар. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся станам спраў у эканоміцы Віцебскай і Гродзенскай абласцей.

Памочнік Прэзідэнта — галоўны інспектар па Гродзенскай вобласці Уладзімір Даманеўскі расказаў журналістам, што Прэзідэнту было дакладзена аб стане спраў на спажывецкім рынку, як спрацавалі ў няпростых знешніх умовах кіраўніцтва прадпрыемстваў і вобласці. «У цэлым рэгіён завяршае год са станоўчымі вынікамі», — адзначыў ён. Закранаючы сітуацыю на валютным рынку, Уладзімір Даманеўскі канстатаваў, што яна сёння стабільная. «Былі ўсплёскі ў апошнія дні мінулага тыдня, але сёння ў выніку захадаў, прынятых урадам і Нацбанкам, сітуацыя стабілізавалася», — дадаў ён. Уладзімір Даманеўскі далажыў кіраўніку дзяржавы, як ідуць справы з імпартам тавараў, улічваючы, што Гродзенская вобласць мяжуе з ЕС. Тэндэнцыя да павелічэння ёсць, але яна знаходзіцца пад кантролем.

Памочнік Прэзідэнта — галоўны інспектар па Віцебскай вобласці Мікалай Шарстнёў у сваю чаргу адзначыў, што Прэзідэнту было дэталёва дакладзена аб развіцці рэгіёна: якія поспехі ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, як працуюць ахова здароўя і гандаль. Абмяркоўвалася на сустрэчы сітуацыя ў прыгранічны ў сувязі з дэвальвацыяй расійскага рубля. «Тэндэнцыі з масавым спажываннем расійскага тавару толькі часовыя. Але гэта не павінна мець масавы характар. Прынятыя меры як у Беларусі, так і ў Расіі стабілізавалі сітуацыю ў прыгранічны. Чакаць новых усплёскаў не давядзецца», — падкрэсліў Мікалай Шарстнёў.

## Перадсвяточны «ўраджай»



У базісным лесагадавальніку Светлагорскага лясгаса ідзе нарыхтоўка дрэўцаў для продажу на ёлачных базарах. Свята хопіць на ўсіх!

Фота БЕЛТА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Пётр ПРАКАПОВІЧ, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«На жаль, сёлета мы працуем ва ўмовах, якія не маглі прадбачыць у пачатку года. Распрацоўваючы праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2014 год, немагчыма было прадбачыць падзеі ва Украіне і тым больш думаць пра тое, што можа адбыцца ў нашага галоўнага партнёра — Расійскай Федэрацыі. Таму, натуральна, даводзілася па ходзе карэктаваць усе праграмы, планы, прыстасоўвацца да знешніх умоў, каб вырашаць галоўныя задачы. Але ў той жа час, нягледзячы на гэтыя аб'ектыўныя і суб'ектыўныя ўмовы, галоўная задача па недапушчэнні зніжэння жыццёвага ўзроўню насельніцтва выканана. Нам гэта ўдалося: за адзінаццаць месяцаў тэмп росту рэальных даходаў насельніцтва складае 101,7%».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.12.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10930,00 | ▲ |
| Еўра | 13400,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 193,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 690,93 | ■ |

■ Кропкі над «і»

## У НОВЫ ГОД СА СТАРЫМІ ЦЭНАМІ

### Тых, хто не згодны, будуць жорстка караць

**«Алё! Прывітанне! Слухай, што ў нас там з курсам здарылася — гэта дэвальвацыя?» Некалькі падобных званкоў ад знаёмых я атрымаў мінулай пятніцай, знаходзячыся ў камандзіроўцы і яшчэ сам не зусім разумеючы, што адбылося. На выхадных, калі вярнуўся дадому, паслухаў, дзе што кажуць, і не асабліва надаў падзеі ўвагу (прынамсі, як асобны жыхар краіны). Але неўзабаве я ўбачыў, як адрэагавалі іншыя. Нядзельнай раніцай пайшоў на рынак, што побач з домам. Нічога незвычайнага быццам і не было: як заўсёды перад Новым годам, шмат людзей, мітусня. Толькі вока чапляецца за шматлікія шыльды «У нас усё па старых цэнах». А людзі стараюцца першымі нешта выбраць, не асабліва эканомяць, бяруць па некалькі найменняў тавараў. Падыходжу да патрэбнага мне бокса...**

#### ЦЭНЫ НЕ ПАДНЯЛІ, АЛЕ ТАВАРЫ ЗНІКЛІ

А тут, як і раней, стабільная чарга з пяці-шасці чалавек. Прадавец вельмі харызматычны і ў яго шмат «пастаянных кліентаў». Мне ў яго патрэбна была толькі (прабачце) туалетная папера. Шчыра кажучы, думаў, што наўрад ці знайду яе па ранейшым кошце. Аднак тыя ж 27 тысяч на цэнніку. Калі разлічваюся, гандляр кажа: «Вось бачыце — не падняў амаль цэн. Толькі на вельмі дарагія тавары». У іншым месцы, дзе хацеў набыць для жонкі яе любімы ласунак, мне пашчасціла меней. Не, цэны і там не падняліся, аднак патрэбнага мне тавару не было. «Не ведаю цяпер, калі зноў прывязу, — сказала мне гандлярка. — З пастаўшчыкамі цяжка размаўляць, а паднімаць кошт не хачу, бо ніхто купляць не будзе». Яшчэ адзін павільён, дзе даўно нагледзеў адну цацку для дачкі і цяпер вырашыў набыць, мяне таксама не парадаваў. Патрэбнай мне рэчы ўжо не было, і, калі можа з'явіцца, прадаўцы не ведаюць.

СТАР. 2

■ Надвор'е

## ТЫДЗЕНЬ МОКРАГА СНЕГУ І ДАЖДЖУ

### А на выхадныя падмарозіць да мінус 13

**У аўторак тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў няўстойлівых паветраных мас, якія рухаюцца да нас з боку Балтыйскага мора, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму сёння ў большасці раёнаў краіны пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-18 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 2-8 цяпла. Даволі вільготнае паветра завітае да нас з боку Атлантыкі 24 і 25 снежня, калі паўсюдна чакаецца мокры снег і дождж. У асобных раёнах слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература ў сераду на працягу сутак ад мінус 1 градуса па паўночным усходзе да плюс 7 градусаў на паўднёвым захадзе краіны. У чацвер тэмпературны фон на працягу сутак будзе вагацца ад мінус двух градусаў на поўначы краіны да 5 цяпла па поўдні Беларусі. Сіноптыкі адзначаюць, што ў сераду і чацвер захаваюцца даволі некамфортныя ўмовы надвор'я, калі парывы ветру будуць дасягаць часам 15-18 м/с.

Ужо ў пятніцу да нас прыйдзе холад са Скандынавіі. Уначы на пятніцу паўсюдна, а ўдзень месцамі чакаецца кароткачасовы снег. Паўсюдна на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы 1-8 марозу, а на поўначы пры праясненнях — да мінус 10 градусаў. Удзень — ад 0 да 6 марозу.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у суботу і нядзелю да нас вяртаецца зіма. У асобных раёнах пройдзе кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ўначы прагназуецца ў межах 3-10 марозу, пры праясненнях — да мінус 13 градусаў, а ўдзень — ад нуля да мінус 7 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**



## КАБ У СУСЕДЗЯЎ УСЁ БЫЛО ДОБРА

### Беларусь гатова заўсёды аказваць дапамогу Украіне

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы ў Кіеве са сваім украінскім калегам Пятром Парашэнкам, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка нашай дзяржавы.**

«Я хачу, каб ва Украіне было добра. Многія гэта разумеюць як нейкія гульні. Я ведаю, што вы не так гэта ўспрымаеце. Вы прэзідэнт, вам балюча. Мне таксама балюча. І я з гэтага зыходжу», — адзначыў беларускі лідар. «Для нас гэта не гульня. Не толькі таму, што тавараабарот, а таму, што мы суседзі, мы побач жывём, мы родныя людзі», — дадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў Пятра Парашэнку не казаць пра сваю заслугу адносна мінскіх дамоўленасцяў. «Вы пазванілі мне: арганізуй, дапамажы, нашы людзі прыедуць, прыедуць прадстаўнікі. Я арганізатар, я не міратворац і не пасярэднік», — сказаў беларускі лідар.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Кітай паабяцаў дапамагчы Расіі справіцца з цяжкасцямі ў эканоміцы



Кітай гатовы аказаць Расіі дапамогу ў пераадоленні эканамічных цяжкасцяў, з якімі сутыкнулася краіна ў апошні час. Такую заяву зрабіў журналістам міністр замежных спраў КНР Ван І. «Калі расійскаму боку спатрэбіцца, мы забяспечым неабходную дапамогу ў рамках нашых магчымасцяў», — цытуе словы міністра газета China Daily. У той жа час Ван І падкрэсліў, што «Расія мае здольнасць і мудрасць, каб пераадолець існуючыя цяжкасці ў эканамічнай сітуацыі». Навуковы супрацоўнік Кітайскай акадэміі сацыяльных навук Лі Цзяньмінь, погляд якога прыводзіць выданне, выказаў здагадку, што дапамога Кітая будзе прапаноўвацца праз такія механізмы, як Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва і БРІКС.

### Трох паліцэйскіх забілі ў ЗША за апошнія некалькі сутак

У горадзе Тарпон Спрынгс, штат Фларыда, невядомы застрэліў паліцэйскага ў тры гадзіны ночы. Гэта ўжо трэці паліцэйскі, забіты ў ЗША за апошнія некалькі сутак, перадаюць інфармагенцтвы. Паведамляецца, што падазраваны паспрабаваў уцячы з месца здарэння на аўтамабілі, але па дарозе ўрэзаўся ў слуп і ў іншы аўтамабіль, пасля чаго быў затрыманы паліцыяй. Днём раней у Брукліне ўзброены цемнаскуры мужчына застрэліў двух паліцэйскіх, якія знаходзіліся ў патрульнай аўтамашыне. Пасля гэтага ён забег у метро і застрэліўся. Прыкладна за тры гадзіны да нападу злачынец пакінуў на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы Instagram некалькі пагроз у адрас паліцыі. Адно з паведамленняў абвяшчала: «Яны забілі аднаго з нашых, давайце заб'ем дваіх з іх». Па звестках СМІ, забойства паліцэйскіх у Нью-Ёрку магло быць помстай за адмову журы прысяжных прыцягнуць да суду вартавых парадку, ад рук якіх у апошнія месяцы загінулі некалькі бяззбройных цемнаскурых амерыканцаў. У ЗША з канца лістапада праходзяць масавыя акцыі пратэсту супраць жорсткасці і расавай дыскрымінацыі з боку паліцыі.

### Куба і ЗША аднаўляюць дыпламатычныя адносіны

Куба і Злучаныя Штаты Амерыкі дамовіліся аднавіць дыпламатычныя адносіны, паведаміў Старшыня Дзяржаўнага Савета і Савета Міністраў Рэспублікі Куба Рауль Кастра Рус у сваім выступленні па радыё і тэлебачанні краіны. «Гэта не сведчыць пра тое, што вырашана галоўная праблема. Эканамічная, гандлёвая і фінансавая блакада працягвае наносіць шкоду народу і эканоміцы нашай краіны. І гэтая блакада павінна спыніцца», — адзначыў Рауль Кастра.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### У конкурсах прыгажосці «Міс свету» больш не будзе шоу ў бікіні

Адзін з найбуйнейшых конкурсаў прыгажосці «Міс свету», які праводзіцца з 1952 года, чакаюць сур'ёзныя змены. Як заявілі арганізатары мерапрыемства, з яго праграмы канчаткова будзе выкрэслены такі элемент, як шоу ў бікіні. Як патлумачыла Джулія Морлі, арганізатар міжнародных конкурсаў прыгажосці «Міс Свету» і жонка заснавальніка конкурсу Эрыка Морлі, прычынай адмовы ад паказаў дзяўчат у бікіні стала змена канцэпцыі мерапрыемства. Морлі лічыць, што пераможца конкурсу «павінна ацэньвацца не па формах, а па змесце».



КОРАТКА

**У Камітэце дзяржаўнага кантролю Беларусі створана рабочая група па кантролі за сітуацыяй на валютным і спажывецкім рынках краіны.**

Стаўка адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў, за выключэннем тых, хто здае кватэры на суткі, у Мінску з 1 сакавіка 2015 года павялічыцца на 15%.

**Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай хірургіі створаць у Беларусі ў 2015 годзе. Ён аб'яднае ў сабе дзіцячую кардыяхірургію РНПЦ «Кардыялогія» і дзіцячы хірургічны цэнтр 1-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска.**

У Шчучыне да Дня пісьменства плануюць завяршыць рэстаўрацыю палаца Друцка-Любецкіх.

**Больш як 2 тыс. неэксплуатуемых аўтамабіляў выяўлена ў Мінску з пачатку года.**

У Лельчыцах 20-гадовы грузчык ударыў сябе кавалкам асфальту, каб інсцэніраваць рабаванне.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «Адна з лепшых газет на беларускай мове»

**Паэт, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар ШНІП:**

— Калі я толькі пачаў чытаць, у маёй сям'і ўжо выпісвалі «Звязду». І ўсё жыццё бацькі заставаліся вернымі ёй.

Свой літаратурны шлях я пачынаў у гэтым выданні. У 1972 годзе, калі мне было 12 гадоў, першыя вершы я даслаў у «Звязду». І атрымаў адказ ад Міколы Гамолкі (той ліст дагэтуль у мяне захоўваецца). Было надзвычай прыемна малому хлапчуку атрымаць ліст з такога сур'ёзнага выдання. Да таго ж звяздоўцы заклікалі мяне пісаць далей, дасылаць свае новыя творы — а маглі б адмахнуцца ад дзіцяці, сказаць, каб заняўся нечым больш сур'ёзным.



Маё першае інтэрв'ю таксама было апублікавана ў «Звяздзе». Памятаю, было мне 22 гады, я працягваў друкаваць вершы, але мне параілі паспрабаваць сябе ў якім-небудзь журналісцкім жанры. Прапанавалі зрабіць інтэрв'ю — з Рыгорам Барадуліным. Прыйшоў я тады да паэта дадому, бо быў з ім знаёмы. Ні дыктафона, ні нават паперы з сабой не ўзяў. Як рабіць інтэрв'ю, нават не ўяўляў. Барадулін прапанаваў мне сесці, даў паперу і аўтаручку. Ён сам сабе задаў пытанне, а пасля і адказаў на яго, — а я толькі запісваў. Па такой схеме мы і зрабілі інтэрв'ю (на той час я яшчэ не меў патрэбнай адукацыі, скончыў архітэктурна-будаўнічы каледж; ужо пазней я вучыўся ў Літаратурным інстытуце ў Маскве). Маю «дыктоўку» Барадуліна я аднёс у «Звязду». Яе ацанілі станоўча і нават заплацілі ганарар. Але было неяк няёмка, бо маёй працай было толькі запісаць. Я нават хадзіў да паэта, каб аддаць яму тыя грошы. Але ён адмовіўся іх узяць, сказаў, што ганарар належыць мне, бо я паставіўся да справы сур'ёзна.

«Звязду» я люблю, бо яна наша, беларуская. Зусім нядаўна памерла мая мама, якая ў нашай вёсцы была самым адданым чытачом газеты. Звычайна яна чытала, а бацька слухаў. Але калі мамы не стала, бацька ўсё адно працягваў выпісваць «Звязду». Калі я прыязджаю ў родную вёску Пугачы Валожынскага раёна, заўсёды бачу гэтыя старыя газеты, пажаўцелыя ад часу. У іх для мяне прысутнічае цяпло, святло вачэй і рук мамы. Я заўважаю, як яна штосьці запісвала на палях, нешта падкрэслівала ў тэкстах — для мяне гэта заўсёды прыемна.

У горадзе я працягваю выпісваць «Звязду», бачу, як яна мяняецца, як прыходзяць новыя аўтары. Назіраю за тым, як пішуць студэнты першага, другога курсаў Інстытута журналістыкі, а ўжо праз пэўны час яны працуюць у штаце. З гэтай газетай я ўжо больш за 30 гадоў і не збіраюся ёй здраджваць, бо гэта адна з лепшых газет на беларускай мове.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

## КАДРАВЫЯ РАШЭННІ ПРЭЗІДЭНТА

Аляксандр Лукашэнка 20 снежня назначыў Аляксандра РАДЗЬКОВА памочнікам Прэзідэнта Беларусі.

22 снежня Прэзідэнт Беларусі вызваліў Пятра РУДНІКА ад пасады старшыні Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

# КАБ У СУСЕДЗЯЎ УСЁ БЫЛО ДОБРА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу, што, нягледзячы на сітуацыю ва Украіне, двухбаковы тавараабарот не ўпаў, а наадварот, дэманструе рост. Больш за тое, Украіна сёння зацікаўлена ў куплі беларускіх тавараў па шырокім спектры. «У нас наогул няма ні цэнта запазычанасці з боку Украіны. Стапрацэнтна аплачаны нашы кантракты з вамі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Пётр Парашэнка падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за атрыманую ўнікальную магчымасць дыялогу трохбаковай кантактнай групы для вырашэння надзённых праблем. Ён таксама асобна падзякаваў за выразную пазіцыю Беларусі адносна суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасці і незалежнасці краіны.

«Спадзяюся, што ў выніку нашага дыялогу мы і мінскія сустрэчы, і іх інтэнсіўнасць адновім, і спадзяюся, што сёння мы будзем мець магчымасць поўнамаштабна абмеркаваць увесь пералік патэнцыяльных магчымасцяў, якія адкрываюцца для нашага супрацоўніцтва», — сказаў Прэзідэнт Украіны.

Кіраўнік украінскай дзяржавы звярнуў увагу на значнасць сустрэч у Мінску. «Дзякуючы нашаму з вамі эфектыўнаму ўзаемадзеянню сёння ўжо ў гісторыю дыпламатыі ўвайшлі тэрміны «мінскі фармат», «мінскі мемарандум», «мінскі пратакол» і «мінскія дамоўленасці». Увесь свет сёння гаворыць, што яны з'яўляюцца асновай мірнага плана прэзідэнта Парашэнкі і асновай мірнага працэсу ва Украіне. Яны прызнаны ААН, Еўрапейскім саюзам, краінамі вялікай дваццаткі і фактычна з'яўляюцца безальтэрнатыўнай мадэллю дээскалацыі сітуацыі на частцы тэрыторый Данецкай і Луганскай абласцей», — сказаў Прэзідэнт Украіны.

Пётр Парашэнка звярнуў увагу на цёплы і дружалюбны характар адносін як паміж дзвюма краінамі, так і паміж прэзідэнтамі.

Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі пытанні эканамічнага супрацоўніцтва, каардынацыі дзеянняў у міжнародных арганізацыях, узаемадзеяння ў сферы бяспекі, фінансавага супрацоўніцтва.

На сустрэчы ў пашыраным фармаце Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз запэўніў, што Беларусь будзе рабіць усё магчымае для ўсталявання міру ва Украіне.

Беларускі лідар расказаў, што ў фармаце тэт-а-тэт прэзідэнты ўзнялі і тэму канфлікту на ўсходзе Украіны. «Я скажу, што ўсё, што было абяцана беларусамі, свята выконваецца. Вы да нас прэтэнзій не маеце, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Вы мяне не падпракнулі ні ў чым. Мы і далей будзем рабіць усё для таго, каб тут быў мір і спакой. Мы кроўна ў гэтым зацікаўлены». «Госпадам Богам нам прадвызначана жыць на гэтай зямлі поплеч. Мы заўсёды жылі па-чалавечы, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я добра ведаю ўкраінцаў, ведаю Украіну, і для мяне асабіста тут ніякіх праблем ніколі не было. Таму мы будзем усё рабіць для таго, каб тут было добра».

На сустрэчы ў пашыраным складзе прэзідэнты зрабілі акцэнт на больш канкрэтных практычных пытаннях двухбаковага супрацоўніцтва, у прыватнасці, у паліўна-энергетычнай сферы, машынабудаванні, міжрэгіянальным узаемадзеянні.

Кіраўнікі дзяржаў дамовіліся аб стварэнні ў Беларусі сумеснага з Украінай тэлеканала. «Мы даўно гаварылі пра тое, што беларусы маюць права ведаць розныя пункты гледжання, і было б нядрэнна, калі б адзін з інфармацыйных каналаў Украіны меў магчымасць транслявацца на тэрыторыі Беларусі», — адзначыў Пётр Парашэнка.

Ён таксама запэўніў, што Украіна шчыра зацікаўлена, каб гандлёва-эканамічныя, палітычныя адносіны, супрацоўніцтва ў сферы бяспекі з Беларуссю развіваліся з максімальнай эфектыўнасцю.

* * *

Беларусь выступае за аднаўленне актыўных гандлёва-эканамічных сувязяў з Украінай, заявіў памочнік Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў, каментуючы вынікі рабочага візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Кіеў, паведамляе БЕЛТА.

«Падчас візіту ў Кіеў Аляксандр Лукашэнка, які шчыра зацікаўлены ў нармалізацыі сітуацыі ва Украіне, абмеркаваў з украінскім лідарам палітычныя, эканамічныя і інфармацыйныя пытанні. Трэба весці дыялог на ўсіх узроўнях. Прэзідэнт Беларусі паказвае, што такі дыялог заўсёды магчымы», — адзначыў памочнік Прэзідэнта.

Падчас перамоў двух лідараў вялікая ўвага была нададзена развіццю эканамічных сувязяў паміж дзвюма краінамі. Аляксандр Радзькоў выказаў упэўненасць у добрых перспектывах эканамічнага супрацоўніцтва Беларусі з Украінай. «Беларусь гатовая дапамагчы суседняй краіне і прапанаваць шырокі спектр тэхнікі. Акрамя таго, гаворка можа ісці аб сумесных прадпрыемствах, якія выпускаюць прамысловую, сельскагаспадарчую тэхніку, — працягнуў памочнік Прэзідэнта. — Сумесна выпрацаваную прадукцыю можна будзе пастаўляць на тэрыторыю Мытнага саюза і Еўрасаюза. Але трэба знайсці такія пункты па многіх пытаннях, каб гэта запрацавала. Гэтыя пытанні і абмяркоўваліся на перамовах у Кіеве». Аляксандр Радзькоў падкрэсліў важнасць таго, што ўкраінскі бок таксама настроены на такое эфектыўнае супрацоўніцтва.

# «ВЕКТАР ДАБРЫНІ» Ў ГРОДЗЕНСКІХ ПАЛІКЛІНІКАХ

**Чатыры аўтамабілі маркі «Джылі» медустановам горада перадаў Беларусбанк.**

Дзве машыны атрымала паліклініка № 4, па адной — паліклініка № 5 і дзіцячая паліклініка № 2. Уручаючы на цэнтральнай плошчы абласнога цэнтра кіроўцам ключы ад аўтамабіляў, старшыня праўлення банка Сяргей Пісарык зазначыў, што ў рамках праграмы «Беларусбанк. Вектар дабрыні» будзе палепшана матэрыяльна-тэхнічная база сістэмы аховы здароўя Гродна. Старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў Гой выказаў падзяку кіраўніцтву банка за партнёрства ў сацыяльнай сферы: «Гэтыя машыны будуць добрай дапамогай для аператыўнага і якаснага абслугоўвання людзей».

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ Гучная справа

# «Моцны» прыгавор...

## вынес Клімавіцкі раённы суд былой маці-выхавацелю Ірыне Моцнай

**У справе, якая была распачата некалькі месяцаў таму, пастаўлена кропка. Аб трагедыі вакол былога дзіцячага дома сямейнага тыпу Віктара і Ірыны Моцных з Клімавічаў, у сям'і якіх выхоўваліся 6 прыёмных дзяцей ва ўзросце ад 9 да 16 гадоў, «Звязда» раней паведамляла. Нагадаем, сёлета 12 ліпеня Клімавіцкі райвыканкам прыняў рашэнні аб спыненні дзеяння дзіцячага дома і вызваленні Ірыны Моцнай ад абавязкаў маці-выхавацеля. Жанчына абвінавачвалася ў тым, што «мелі месца факты неналежнага выканання службовых абавязкаў, фізічнага пакарання, пакідання дзяцей на староннiх асоб без дазволу органаў апекі». Але Ірына палічыла гэтае рашэнне неабгрунтаваным, у выніку чаго некалькі разоў суд разглядаў яе справу. Прычым ніводны разгляд не скончыўся на яе карысць. Ёй прыйшлося выплаціць штраф за самаўпраўства. А яе родны сын, студэнт сталічнай ВНУ, таксама пакараны штрафам за абразу супрацоўніка міліцыі пры выкананні ім службовых абавязкаў.**

На працягу некалькіх месяцаў Следчым камітэтам Клімавіцкага раёна разглядалася крымінальная справа ў дачыненні да Ірыны Моцнай. Нагодай стаў зварот сваякоў яе былых выхаванцаў. Жанчына абвінавачвалася адразу па 3 артыкулах Крымінальнага кодэкса. За гэты тэрмін быў праведзены шэраг экспертыз, дапытана 30 сведак, праводзіліся вочныя стаўкі. Вынікі гэтых даследаванняў ляглі ў аснову крымінальнай справы ў 2 тамах. Суд праходзіў за зачыненымі дзвярыма ў мэтах захавання інтарэсаў пацярпелых непаўналетніх дзяцей. За месяц адбылося некалькі пасяджэнняў. Вынесены прыгавор. Паводле слоў дзяржаўнага абвінаваўцы, памочніка пракурора Клімавіцкага раёна Наталлі Гапеевай, Ірына Моцная прысуджана да 4 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі агульнага рэжыму. Жанчына была ўзята пад варту ў зале суда. У 10-дзённы тэрмін з моманту ўручэння ёй копіі прыгавора яна мае права яго абскардзіць.

«Звязда» будзе працягваць адсочваць падзеі вакол былога дзіцячага дома сямейнага тыпу.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# У новы год са старымі цэнамі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры гэтым перада мною адна жанчына брала некалькі розных цацак, нават не пытаючыся пра цэны. Выглядала прыкладна так: «А што ў вас яшчэ ёсць? Ага, давайце. А яшчэ што?»

Вырашыў зайсці ў размешчаны тут жа гандлёвы цэнтр. Людзей таксама шмат, нават болей, чым на рынку. Па дарозе да патрэбнай мне крамы сустрэў вялікую чаргу ў магазін абутку: людзі стаялі звонку, бо іх не пускалі чамусьці ўсярэдзіну, а літаральна пара пакупнікоў праходжвалася па краме. Далей убачыў наступствы папярэдняга «штурму» магазіна з рознай тэхнікай — пустыя паліцы і рэдкія пакупнікі, якія спрабуюць знайсці хоць што-небудзь, каб набыць.

Але на гэтым прыгоды не скончыліся. Як аказалася, банкі таксама зрэагавалі на ажыятажны попыт — у выніку маю крэдытную картку абнулілі. Не вялікая бяда, проста менавіта ў гэты час мне трэба было ёю скарыстацца. Аднак калі нават банкі спужаліся, што людзі пабягуць усё скупліваць у крамах за іх грошы, то справа сапраўды сур'ёзная. Толькі з чаго б такі настрой у народа? Як мы ўжо паведамлялі, 19 снежня Нацбанк заявіў аб часовым увядзенні 30-працэнтнага збору пры куплі валюты юрыдычнымі і фізічнымі асобамі. Такое рашэнне было прынята з улікам узрослага попыту на долары і еўра на ўнутраным валютным рынку. Прадпрыемствы і банкі павінны выплачваць цяпер збор пры набыцці валюты на біржы, грамадзяне — у выглядзе камісіі ў банках. Выплачаныя сродкі збіраюцца накіраваць у бюджэт. Акрамя таго, усе буйныя беларускія банкі ўводзяць тэрміновы гарантаваны ашчадны ўклад з механізмам індэксацыі рублёвых зберажэнняў пры змене абменнага курсу беларускага рубля. Таму па сутнасці дэвальвацыі не адбылося. Хутчэй, наадварот — яе імкнуцца пазбегнуць ці мінімізаваць. І бегчы ў краму — не самы лепшы варыянт. Тым больш што захад гэты часовы.

### ДЛЯ ІНФЛЯЦЫІ НЯМА ПАДСТАЎ

Паводле слоў **прэм'ер-міністра Міхаіла МЯСНІКОВІЧА**, для скачка інфляцыі ў Беларусі няма падстаў. «Няма прычын казаць, што будзе інфляцыя на ўзровень валютнага збору, — падкрэсліў ён. — У нас энергетыка абаронена, уклады абаронены, і заработная плата застаецца ў рамках тых разлікаў і балансаў, якія мы вызначылі на 2014-2015 год». Кіраўнік урада нагадаў, што прадпрыемствы не будуць плаціць збор пры набыцці валюты для разлікаў за нафту, нафтавы (спадарожны) газ, іншыя вадкія і газападобныя вуглевадароды, прыродны газ і за электрычную энергію. А даходнасць гандлю імпарцёраў нават пры 30-працэнтным валютным зборы будзе вышэйшай, чым у аналагічнага бізнесу ў Расіі ці Украіне, дзе ўзровень дэвальвацыі нацыянальных валют дасягнуў 180% і 200% адпаведна. Але прэм'ер не выключае, што «нейкі імпартны тавар падаражэе».

Міхаіл Мясніковіч паведаміў, што захады ўрада і Нацбанка будуць дзейнічаць да 1 лютага 2015 года, і расказаў пра дзеянні для абароны рублёвых укладаў насельніцтва. Так, да 50% гадавых павышаны працэнтныя стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях падтрымкі ліквіднасці банкаў. Гэта, у сваю чаргу, прывядзе да прапарцыянальнага павелічэння ставак па дэпазітах у нацыянальнай валюце. Усімі буйнымі банкамі ўведзены тэрміновы гарантаваны ашчадны ўклад з механізмам індэксацыі рублёвых зберажэнняў пры змене абменнага курсу беларускага рубля. Пры гэтым любы грамадзянін можа купляць і прадаваць валюту без абмежаванняў. Акрамя таго, паводле слоў **старшыні праўлення Нацбанка Надзеі ЕРМАКОВАЙ**, праблема недахопу наяўнай замежнай валюты ў абменных пунктах камерцыйных банкаў будзе вырашана вельмі хутка.

> ## Лічба
>
> **Даход у бюджэт ад увядзення 30-працэнтнага валютнага збору чакаецца ў памеры каля 5 трлн рублёў, паведаміў першы намеснік міністра фінансаў Максім ЕРМАЛОВІЧ.**

> ## Павышэнне коштаў — гэта звычайная прага нажывы
>
> ***Так думае старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ: «Законных падстаў для ўзняцця цэн няма, але асобныя гандлёвыя прадпрыемствы і індывідуальныя прадпрымальнікі захацелі атрымаць дадатковы даход ад ажыятажнага попыту. Мы гэтую сітуацыю маніторым», — растлумачыў мэр Мінска. Паводле яго слоў, адпаведныя службы зафіксавалі ўзровень коштаў і пры выяўленні завышэння будуць вельмі жорстка рэагаваць, ужываючы ўсе законныя метады для таго, каб цэны вярнуць назад. Па словах старшыні Мінгарвыканкама, ажыятажны попыт ужо спадае. Людзі бачаць, што сёння ўсё можна купіць па тых жа цэнах, што і ўчора, іх ніхто не ўздымаў.***



### АБАРОНА СПАЖЫЎЦА

Нягледзячы на ўсё гэта, цэны там-сям пачалі паднімацца. Улады адразу на гэта адрэагавалі і папярэдзілі аб жорсткай адказнасці за такія вольнасці. Напрыклад, урад даручыў Міністэрству эканомікі ўвесці мараторый на любое павышэнне тарыфаў на паслугі натуральных манаполій і суб'ектаў гаспадарання, якія займаюць дамінуючае становішча на таварным рынку. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў №1207 ад 19 снежня 2014 года. Дакумент прыняты ў мэтах недапушчэння росту рознічных цэн і забеспячэння спажывецкага рынку шырокім асартыментам тавараў. «Каб у перадсвяточны час ажыятажнага попыту не было імклівага павышэння коштаў і з улікам іншых абставін, Міністэрства гандлю прыняло рашэнне ўвесці мараторый на рост коштаў як у розніцы, так і цэн, якія адпускае вытворца або пастаўшчык, магчыма, нават імпарцёр. Гэта рашэнне засцеражэ грамадзян ад галапіруючага павышэння коштаў», — заявіла **намеснік міністра гандлю Ірына НАРКЕВІЧ**. Пры гэтым рашучыя меры, якія прымаюцца Мінгандлем у дачыненні да аб'ектаў гандлю, якія дапускаюць у працы парушэнні заканадаўства, нельга трактаваць як барацьбу з прыватнікам, лічыць **міністр гандлю Валянцін ЧАКАНАЎ**.

Увогуле, арганізацыі гандлю, якія парушаюць цэнавую дысцыпліну і санітарную бяспеку, будуць жорстка карацца, паведаміў Міхаіл Мясніковіч. Па звестках прэм'ера, фіксуюцца шматлікія факты нядобрасумленных паводзін асобных арганізацый гандлю, якія хочуць скарыстацца сітуацыяй і падняць кошты. У якасці прыкладу ён прывёў сітуацыю з крамамі сеткі «5-ы элемент», якія на днях у самы разгар продажаў нечакана зачыніліся па тэхнічных прычынах. Пакупнікам патлумачылі, што за выбраным таварам яны змогуць прыйсці на наступны дзень і набыць яго па тым жа кошце. Між тым і назаўтра крамы аказаліся зачыненымі. «За такія рэчы трэба караць, і мы караем вельмі строга. Аж да крымінальнай адказнасці службовых асоб, якія такім чынам правакуюць і хочуць несумленна зарабіць на нюансах, выкліканых не ўнутранымі абставінамі, а знешнімі прычынамі», — заявіў прэм'ер-міністр. Кіраўнік урада дадаў, што нядаўна выйшаў указ, які прадаставіў дадатковыя паўнамоцтвы міністру гандлю, галоўнаму санітарнаму ўрачу. «Гэта робіцца не для таго, каб некага напалохаць. Але павінен быць парадак».

Дарэчы, гандлёвыя аб'екты, па словах Ірыны Наркевіч, не павінны закрывацца без узгаднення рашэння пра закрыццё з адміністрацыямі раёнаў, на тэрыторыі якіх знаходзяцца. А некаторыя спецыялісты кажуць, што ў сітуацыі, якая склалася, гандлёвым сеткам трэба думаць не пра павышэнне коштаў, а пра павелічэнне абароту.

### ІНТЭРНЭТ ЗАБЫЎ ПРА ЗАКОН

«Рашэнне аб закрыцці інтэрнэт-сайта Onliner.by прымалася не за адзін дзень, папярэджанні гэтай пляцоўцы выносіліся на працягу года», — каментуе закрыццё сайта Ірына Наркевіч. А дамен Onliner.by увогуле выключаць з рэестра нацыянальнай даменнай зоны за парушэнне заканадаўства аб гандлі. Такая інфармацыя з'явілася на сайце Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Беларусі. Агулам Міністэрства гандлю прыпыніла працу 13 інтэрнэт-крам. Яны дапусцілі парушэнні заканадаўства аб гандлі і абароне правоў спажыўцоў, што выявілася, у прыватнасці, у незахаванні патрабаванняў аб размяшчэнні на сайце цаны выключна ў беларускіх рублях, поўнай інфармацыі аб прадаўцы, вытворцы і імпарцёры, рэквізітаў аб дзяржаўнай рэгістрацыі індывідуальнага прадпрымальніка. Праца інтэрнэт-крам будзе адноўлена пры ўмове падачы суб'ектамі гандлю ў Мінгандль дакументаў, якія пацвярджаюць выкананне выдадзеных ім прадпісанняў аб спыненні парушэнняў правоў спажыўцоў.

Прадпісанні аб ліквідацыі выяўленых парушэнняў заканадаўства аб рэкламе вынесены сайтам www.deal.by, www.migom.by, www.kufar.by. На іх размяшчаецца рэклама тавараў з указаннем кошту ў доларах ЗША.

> ## Дарэчы
>
> **Здзелкі куплі-продажу замежнай валюты на пазабіржавым валютным рынку Беларусі не будуць ажыццяўляцца да 1 студзеня 2017 года, за выключэннем здзелак з Нацбанкам. Такая інфармацыя змяшчаецца ў пастанове праўлення Нацыянальнага банка Беларусі №788 ад 19 снежня.**



Фота БЕЛТА.

> ## Патлумачылі
>
> **У Нацыянальным банку Беларусі патлумачылі практычнае прымяненне рашэння аб увядзенні камісійнага збору пры куплі фізічнымі асобамі замежнай валюты.**
>
> **Так, камісійны збор дзейнічае на ўсе аперацыі куплі фізічнымі асобамі замежнай валюты. Камісія будзе брацца і пры аплаце тавараў і паслуг за мяжой з дапамогай банкаўскіх плацежных картак (уключаючы карткі міжнародных плацежных сістэм VISA і MasterCard), выдадзеных да рахункаў у беларускіх рублях, пры зняцці за мяжой гатоўкі. Пералік аперацый, з якіх прыйдзецца заплаціць збор, распаўсюджваецца на куплю замежнай валюты ў абменных пунктах і касах банкаў, а таксама з дапамогай банкаўскай аплатнай карткі праз банкамат. Збор спаганяецца пры пераафармленні ў замежную валюту сродкаў, якія знаходзяцца на бягучых (разліковых) банкаўскіх рахунках і ў тэрміновых банкаўскіх укладах (дэпазітах) у беларускіх рублях. 30-працэнтны збор трэба будзе плаціць тым, хто праводзіць разлікі ў інтэрнэце на карысць нерэзідэнтаў, выкарыстоўваючы рэквізіты плацежных картак, выдадзеных да рахункаў у беларускіх рублях.**
>
> ## Між іншым
>
> **Уведзены валютны збор у памеры 30% не адаб'ецца на кошце бензіну і дызельнага паліва на беларускім рынку. Пра гэта заявіў старшыня канцэрна «Белнафтахім» Ігар ЛЯШЭНКА.**

* * *

Супрацоўнікі падраздзяленняў МУС па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі з 19 да 21 снежня прыцягнулі да адказнасці 19 грамадзян за парушэнне правілаў ажыццяўлення валютных аперацый, паведамілі ў прэс-службе МУС Беларусі. Канфіскавана 2363 долары ЗША, 26 тыс. расійскіх рублёў і 30,7 млн беларускіх рублёў. У ведамстве ўдакладнілі, што правапарушэнні зафіксаваны на тэрыторыі Мінска (складзена 11 адміністрацыйных пратаколаў), Магілёўскай (1), Гомельскай (3) і Мінскай (4) абласцей. МУС рэкамендуе грамадзянам устрымацца ад куплі валюты з рук і нагадвае, што адказнасць існуе не толькі для «мянял», але і для тых, хто вырашыў скарыстацца іх паслугамі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ У пошуках рашэння

# НАШЫ ТАВАРЫ ЗНОЎ ЧАКАЮЦЬ У РАСІІ

## А зняцце забароны з апошніх прадпрыемстваў магчымае сёння

**Пра гэта паведаміў намеснік прэм'ер-міністра Міхаіл РУСЫ пасля вяртання з Масквы. «Мы дамовіліся, што будуць разгледжаны пытанні па цэлым шэрагу прадпрыемстваў», — заявіў віцэ-прэм'ер.**

У сваю чаргу прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч лічыць, што партнёры хочуць прыгожа выйсці з сітуацыі. «Рух ідзе, але досыць млява. Зразумела, што гэта звязана не з нейкімі працэдурнымі пытаннямі», — канстатаваў прэм'ер. Паводле яго слоў, асноўныя прадпрыемствы ўжо адкрыты і досыць паспяхова працуюць, у тым ліку на экспарт. Яшчэ каля 10 пакуль не аднавілі экспартныя пастаўкі. Палова з іх была зачынена з-за выяўлення генома АЧС. Міхаіл Мясніковіч расказаў, што цікавіўся ў спецыялістаў, ці можа геном трансфармавацца ў вірус. «Мне было адназначна сказана, што гэта немагчыма», — адзначыў кіраўнік беларускага ўрада.

Пры гэтым калегія Еўразійскай эканамічнай камісіі, прыняўшы да ведама зварот Міхаіла Мясніковіча аб абмежаванні Федэральнай службай па ветэрынарным і фітасанітарным наглядзе паставак сельскагаспадарчай прадукцыі беларускай вытворчасці на рынак Расіі, прыняла шэраг рэкамендацый урадам краін Мытнага саюза. Ураду Расіі рэкамендавана «забяспечыць выкананне патрабаванняў Палажэння аб адзіным парадку правядзення сумесных праверак аб'ектаў і адбору проб тавараў (прадукцыі), якія падлягаюць ветэрынарнаму кантролю (нагляду), упаўнаважаным органам Расійскай Федэрацыі пры ажыццяўленні ветэрынарнага кантролю (нагляду) і прыняцці мер па яго выніках, у тым ліку ў частцы, якая тычыцца аднабаковых абмежаванняў паставак сельскагаспадарчай прадукцыі беларускай вытворчасці». Ураду Беларусі таксама рэкамендавана забяспечыць выкананне патрабаванняў гэтага палажэння ўпаўнаважаным органам краіны, у тым ліку ў частцы аб'ектыўнага разгляду інфармацыі ўпаўнаважанага органа Расіі аб парушэннях, выяўленых у ходзе маніторынгу падкантрольных тавараў (прадукцыі), уключаючы ўнясенне адпаведных звестак у рэестр арганізацый і асоб, якія ажыццяўляюць вытворчасць, перапрацоўку і (або) захоўванне падкантрольных тавараў (прадукцыі), што перамяшчаюцца з тэрыторыі адной дзяржавы — члена Мытнага саюза на тэрыторыю другой.

Урадам дзяржаў — членаў МС пры выкананні патрабаванняў гэтага палажэння рэкамендавана кіравацца Парадкам узаемадзеяння ўпаўнаважаных органаў дзяржаў — членаў Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы пры выяўленні падкантрольнага тавару (прадукцыі), які не адпавядае вызначаным патрабаванням.

І дарэчы, Беларусь і Расія задаволены вынікамі па балансах паставак харчавання ў 2014 годзе. Міхаіл Русы сказаў: «Абодва бакі засталіся задаволеныя балансамі. У прыватнасці, Беларусь перавыканала ў некалькі разоў аб'ём паставак птушкі. Гэта ў Расіі віталі».

Намеснік прэм'ер-міністра адзначыў, што Беларусь і Расія ўжо ўзгаднілі харчовыя балансы на будучы год. «Аб'ём паставак нашага харчавання сур'ёзны, ён большы ў параўнанні з гэтым годам».

**Паводле інфармацыі БЕЛТА.**

■ Тым часам

# «ПРЫШЧЭПКА» АД НЕРВОЗНАСЦІ,

## або Уклад у нацвалюце «прывязалі» да долара

**Цяпер найбуйнейшы банк Беларусі прапануе насельніцтву ўнікальны ўклад «Гарант» у беларускіх рублях, які забяспечвае стабільны ўзровень даходнасці, незалежна ад змены курсу долара, паведамілі ў прэс-службе Беларусбанка.**

Мінімальная сума ўкладу — 10 млн рублёў, на якую банк гарантуе кліентам атрыманне дадатковых працэнтаў, якія забяспечаць вяртанне ўкладзеных зберажэнняў у беларускіх рублях у памерах, эквівалентных суме долараў на дату адкрыцця ўкладу, плюс асноўныя працэнты.

Асноўныя працэнты не змяняюцца на працягу ўсяго тэрміну захоўвання, а дадатковыя працэнты разлічваюцца па формуле, якая ўлічвае змяненні курсу долара за ўвесь перыяд захоўвання ўкладу, і выплачваюцца ў дзень закрыцця рахунку. Узровень асноўных працэнтаў складзе 10% гадавых пры тэрміне ўклада 3 месяцы, на 6 месяцаў — 12% і на 12 месяцаў — 15% гадавых. Спецыялісты Беларусбанка ўдакладнілі, што памер дадатковых працэнтаў вызначаецца ў залежнасці ад змены курсу долара, які ўстаноўлены Нацыянальным банкам на адпаведную дату.

Гэты ўклад не прымаецца структурнымі падраздзяленнямі Белпошты, дадатковыя ўзносы не дазваляюцца. Па ўкладзе дапускаюцца расходныя аперацыі ў межах астатку наліčаных і незапатрабаваных па ўкладзе асноўных працэнтаў. Такая сума далучаецца да рэшты ўкладу ў дзень яе выплаты.

У выпадку вяртання поўнай сумы ўкладу ў перыяд да дня наступлення тэрміну вяртання гэтая аперацыя цягне пераразлік сумы належных да выплаты асноўных працэнтаў у памеры працэнтнай стаўкі, якая дзейнічала па ўкладзе да запатрабавання ў беларускіх рублях для фізічных асоб з улікам змены яе памеру.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Рэгіёны

# Маніторынг і адпаведныя рашэнні

**Упраўленню гандлю і паслуг Гомельскага аблвыканкама дадзена даручэнне забяспечыць усе крамы вобласці айчыннымі таварамі ў неабходных аб'ёмах, каб задаволіць узніклы павышаны попыт на прамысловыя і харчовыя тавары. Такое даручэнне даў на апаратнай нарадзе старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК.**

Кіраўнік рэгіёна адзначыў, што ў сітуацыі, калі па нейкіх прычынах рэзка павялічваецца пакупніцкі попыт насельніцтва, выйграе той, хто хутчэй за ўсіх прымае правільныя кіраўніцкія рашэнні. Адначасова старшыня Гомельскага аблвыканкама даў даручэнне праводзіць маніторынг коштаў ва ўстановах гандлю і ўзмацніць кантроль у галіне антыманапольнай і коштавай палітыкі. Па інфармацыі гомельскага абласнога ўпраўлення гандлю і паслуг, у апошнія дні назіраецца павышаны попыт на бытавую тэхніку, мэблю, іншыя тавары доўгага карыстання як айчыннай, так і імпартнай вытворчасці. Выручка некаторых буйных крам вырасла ў два разы і болей. Ва ўсіх раёнах Гомельшчыны створаны групы па маніторынгу коштаў на тавары, працуюць тэлефоны даверу для пакупнікоў, у выхадныя дні арганізавана дзяжурства супрацоўнікаў органаў мясцовай улады, якія кантралююць работу сферы гандлю і паслуг.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

# ЗНІЖКІ НА ЧВЭРЦЬ

**У гарадах і раённых цэнтрах Віцебскай вобласці плануецца правесці 200 пераднавагодніх і калядных кірмашоў па продажы харчовых і нехарчовых тавараў. У Віцебску кірмашы будуць праходзіць да 7 студзеня. Пакупкі па прывабных цэнах можна зрабіць па выхадных днях на адной з цэнтральных вуліц — Леніна.**

— У святочныя і перадсвяточныя дні — 24, 25, 31 снежня і 7 студзеня — суб'ектам гаспадарання рэкамендавана ўстанавіць у гандлёвых аб'ектах рэжым працы буднага дня, а таксама падоўжыць працу аб'ектаў грамадскага харчавання. Для бесперабойнага забеспячэння насельніцтва таварамі навагодняга асартыменту гандлёвымі прадпрыемствамі вобласці назапашаны шампанскае, падарункавыя наборы... Праводзяцца розныя мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне пакупніцкай актыўнасці, у тым ліку за кошт прадастаўлення зніжак, — паведаміла «Звяздзе» **начальнік упраўлення гандлю і паслуг Віцебскага аблвыканкама Ірына ЛЯЎКОВІЧ.**

Напрыклад, ААТ «Элема» да канца года праводзіць акцыю па рэалізацыі зімовага жаночага асартыменту са зніжкай 25% ад рознічнай цаны. Прадпрыемства «Блік» прадае мужчынскія курткі пэўных мадэляў са зніжкай 15%. 10% і больш можна сэканоміць на касметыцы, абутку, гарсэтных вырабах і бялізнавым трыкатажы...

Паводле інфармацыі Віцебскага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання, цэны на елкі такія: да 1 метра — 65-80 тысяч рублёў, ад 1 да 2 метраў — 85-100 тысяч рублёў, ад 2 да 3 метраў — 110-125 тысяч рублёў, ад 3 да 4 метраў — 200-230 тысяч рублёў, больш за 4 метры — 300-360 тысяч рублёў. Толькі ў Віцебску вызначана 28 месцаў продажу навагодніх елак і соснаў.

У 430 аб'ектах грамадскага харчавання будзе ажыццяўляцца прыём папярэдніх заказаў ад насельніцтва на выраб мучных кандытарскіх, булачных і кулінарных вырабаў, у тым ліку ў святочным афармленні. Усяго плануецца зрабіць на продаж 800 тон прадукцыі грамадскага харчавання, у тым ліку кулінарных вырабаў — 220 тон, булачна-кандытарскіх — 450 тон, паўфабрыкатаў — 130 тон.

Цяпер прымаюцца заяўкі ад насельніцтва, арганізацый і прадпрыемстваў на правядзенне карпаратываў і іншых урачыстых мерапрыемстваў. Распрацоўваецца святочнае меню. У перадсвяточныя і святочныя дні плануецца абслужыць каля 80 тысяч чалавек. Арыенціровачны кошт аднаго заказу складзе ад 350 да 500 тысяч рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ «Нашы дзеці»

# Каб жаданні спраўдзіліся

**«Краіна вызначаецца тым, як яна ставіцца да сваіх дзяцей», — адзначыў старшыня Савета Рэспублікі Анатоль РУБІНАЎ падчас сваёй паездкі ў «SOS-Дзіцячую вёску» ў Мар'іну Горку. Салодкія навагоднія падарункі атрымалі 75 маленькіх выхаванцаў.**



Фота БЕЛТА.

Выхавальнікі і дзеці зладзілі навагодні канцэрт. Хлопчыкі і дзяўчаткі танцавалі венскі вальс, спявалі, ігралі на гітары і фартэпіяна, чыталі вершы. Малыя гледачы ў зале падымаліся з месцаў і станавіліся на дыбачкі, выглядвалі з-за спінаў дарослых і пільна сачылі за дзеяй. Адчувалася, што ў жыхароў дзіцячай вёскі адбылося сапраўднае свята.

Анатоль Рубінаў разам з дзецьмі клікаў Дзеда Мароза, вадзіў карагод і радаваўся таму, што ёлка засвяцілася агеньчыкамі на лік «тры».

— Лепш за Новы год няма свята на зямлі, — звярнуўся да маленькіх гаспадароў старшыня Савета Рэспублікі. — Бо яно самае радаснае. Але самае галоўнае — можна загадаць жаданне, і яно абавязкова спраўдзіцца. Не само па сабе, вядома, а толькі калі вы будзеце моцна старацца і імкнуцца да яго здзяйснення.

Спікер верхняй палаты парламента пажадаў кожнаму імкнуцца перш за ўсё вучыцца. Калі будзе гэта і сумленная праца, можна дасягнуць любых мэт. Сенатар даў таксама параду кожны дзень пражываць поўна і з асалодай. Тады, запэўніў ён, жыццё складзецца шчасліва.

«Я памятаю, як сустракалі 1947 год. Дома — хлеб, соль і вада. Якія там падарункі і пачастункі! Сённяшняе дзяцінства не ідзе ні ў якое параўнанне. Дзіву даюся, як фактычна за пакаленне змянілася жыццё ў краіне», — узгадаў сваё дзяцінства Анатоль Рубінаў. «Самы галоўны падарунак дзецям — любоў. Усё астатняе важна, але другасна», — дадаў ён.

Таксама старшыня Савета Рэспублікі завітаў папіць гарбаты ў адзін з сямейных домікаў. Падчас нефармальнай гутаркі з дзецьмі Ганны Чарнухі Анатоль Рубінаў нагадаў выхавальнікам: «Вельмі важна ў жыцці мець любоў. Да маці, прыроды і роднай краіны».

Сёння SOS-вёска ў Мар'інай Горцы самая буйная на Беларусі. У ёй жывуць 75 дзяцей і 15 мам-выхавальніц. У сярэднім на кожную прыпадае па 5-6 дзяцей. «Тата» на вёску адзін — яе дырэктар Зміцер Калтовіч.

Візіт адбыўся ў рамках рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці». Яна стартавала ў лістападзе гэтага года. Акцыя праходзіць у юбілейны 20-ы раз і за гэты час ужо стала своеасаблівым беларускім брэндам.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# «НАВАГОДНІЯ ПРЫГОДЫ» Ў МАЛАДЗЕЧНЕ

**Старшыня Мінскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА ўручыў дзецям падарункі падчас дабрачыннага свята, што адбылося ў маладзечанскім Палацы культуры.**



Фота БЕЛТА.

— Няхай гэтае свята запомніцца вам надоўга. А на працягу наступнага года будзьце такімі ж шчаслівымі, як сёння, — звярнуўся да юных грамадзян Сямён Барысавіч. — Зычу, каб у кожным доме панавалі мір і спакой, а дзеці былі вясёлымі і здаровымі, і ў будучыні прадоўжылі добрыя справы сваіх бацькоў і зрабілі нашу краіну яшчэ прыгажэйшай. Бывалі розныя часы... Калісьці радаваліся з'яўленню ў доме тэлевізара, а сёння ён ёсць у кожнай сям'і, а ў многіх — нават не адзін. Усё гэта дзякуючы вашым бацькам, якія працуюць, каб жыццё стала лепшым. Менавіта таму ў нашай краіне мір ды згода.

Удзел у свяце, якое прайшло ў межах штогадовай рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці», прынялі больш як 900 хлопчыкаў і дзяўчынак з усіх раёнаў Міншчыны. Гэта дзеці-сіроты і інваліды, выхаванцы са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў, адораныя і таленавітыя вучні. Для іх было наладжана чароўнае падарожжа «Навагоднія прыгоды», куды яны адправіліся разам з Дзедам Марозам і Снягуркай, іншымі казачнымі персанажамі. Усе ахвотныя змаглі сфатаграфавацца на памяць з казачнымі героямі, паўдзельнічаць у майстар-класах па выцінанцы, аквагрыме, вырабе паштовак, наведаць забаўляльныя пляцоўкі «Скарбонка талентаў» і «Навагоднія мініяцюры».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

# ГОРАД ВЯЛІКІХ МАГЧЫМАСЦЯЎ

## У Мінску — каля 15 тысяч вакансій

у пункце 2 словы «не вызваляецца» замяніць словамі «або ўладальнік інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт, не вызваляюцца».

20. У артыкуле 49:

абзац першы пункта 1 пасля слова «інфармацыі,» дапоўніць словамі «або ўладальніку інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт»;

дапоўніць артыкул пунктам $2^{1}$ наступнага зместу:

«$2^{1}$. Пісьмовае папярэджанне выносіцца распаўсюджвальніку рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі ў выпадку:

$2^{1}$.1. парушэння распаўсюджвальнікам прадукцыі тэлевізійных сродкаў масавай інфармацыі патрабаванняў пункта 1 артыкула 261 гэтага Закона;

$2^{1}$.2. распаўсюджвання прадукцыі сродку масавай інфармацыі да яго дзяржаўнай рэгістрацыі або да атрымання замежным сродкам масавай інфармацыі, які распаўсюджвае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь сваю прадукцыю без змянення формы або зместу, адпаведнага дазволу ў рэспубліканскім органе дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі;

$2^{1}$.3. змянення формы або зместу прадукцыі замежнага сродку масавай інфармацыі, якая распаўсюджваецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь без змянення яе формы або зместу;

$2^{1}$.4. распаўсюджвання прадукцыі тэлевізійных і радыёвяшчальных сродкаў масавай інфармацыі да атрымання імі спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) на ажыццяўленне дзейнасці ў галіне вяшчання;

$2^{1}$.5. непаведамлення распаўсюджвальнікам прадукцыі тэлевізійных, радыёвяшчальных сродкаў масавай інфармацыі не пазней як за два працоўныя дні да пачатку (спынення) распаўсюджвання радыё-, тэлепраграмы рэспубліканскаму органу дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі аб пачатку (спыненні) распаўсюджвання радыё-, тэлепраграмы, за выключэннем выпадку, прадугледжанага абзацам трэцім часткі шостай пункта 6 артыкула 17 гэтага Закона;

$2^{1}$.6. парушэння патрабаванняў да распаўсюджвання прадукцыі сродку масавай інфармацыі эратычнага характару, прадугледжаных пунктамі 2 і 3 артыкула 21 гэтага Закона;

$2^{1}$.7. распаўсюджвання прадукцыі сродку масавай інфармацыі без дагавора альбо іншага дакумента, які пацвярджае наяўнасць адпаведных правоў на распаўсюджванне названай прадукцыі, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

$2^{1}$.8. невыканання распаўсюджвальнікам законнага патрабавання дзяржаўнага органа аб ліквідацыі парушэнняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб сродках масавай інфармацыі.»;

у пункце 3:

частку першую пасля слоў «пошце» і «(заснавальнікам) сродку масавай інфармацыі» дапоўніць адпаведна словамі «і (або) электроннай пошце» і «распаўсюджвальніку або ўладальніку інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт»;

частку другую пасля слоў «(заснавальнікі) сродку масавай інфармацыі» дапоўніць словамі», распаўсюджвальнік або ўладальнік інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт»;

пункт 4 пасля слоў «(заснавальнікамі) сродку масавай інфармацыі» дапоўніць словамі «, распаўсюджвальнікам або ўладальнікам інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт,».

21. У артыкуле 50:

у пункце 2 слова «трохмесячны» замяніць словам «шасцімесячны»;

дапоўніць артыкул пунктам 4 наступнага зместу:

«4. Па рашэнні заснавальніка (заснавальнікаў) сродку масавай інфармацыі выпуск сродку масавай інфармацыі можа быць прыпынены на тэрмін да шасці месяцаў, але не часцей як адзін раз на два гады.».

22. У артыкуле 51:

у падпункце 2.1 пункта 2 словы «тэлевізійнага вяшчання і радыёвяшчання» замяніць словамі «вяшчання тэле- або радыёпраграмы»;

пункт 3 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«3. Іск аб спыненні выпуску сродку масавай інфармацыі можа быць прад'яўлены не пазней шасці месяцаў з дня ўзнікнення падстаў, прадугледжаных падпунктамі 2.1 і 2.2 пункта 2 гэтага артыкула.».

23. Дапоўніць Закон артыкулам $51^{1}$ наступнага зместу:

**«Артыкул $51^{1}$. Абмежаванне доступу да прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі, якая распаўсюджваецца пры дапамозе інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт**

1. Абмежаванне доступу да прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі, якая распаўсюджваецца пры дапамозе інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт, ажыццяўляецца па рашэнні рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі ў выпадку:

1.1. вынясення ўладальніку інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт, на працягу года двух і больш пісьмовых папярэджанняў;

1.2. распаўсюджвання пры дапамозе інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт, інфармацыйных паведамленняў і (або) матэрыялаў, забароненых або абмежаваных да распаўсюджвання ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, а таксама з рашэннямі суда, якія ўвайшлі ў законную сілу;

1.3. невыканання ўладальнікам інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт, законнага патрабавання дзяржаўнага органа аб ліквідацыі парушэнняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб сродках масавай інфармацыі.

2. Рашэнне аб абмежаванні доступу да прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі, якая распаўсюджваецца пры дапамозе інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт, у дачыненні да ўладальніка інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт, можа быць прынята не пазней чым у трохмесячны тэрмін з дня ўзнікнення падстаў, прадугледжаных падпунктамі 1.1—1.3 пункта 1 гэтага артыкула.

3. Парадак абмежавання доступу да прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі, якая распаўсюджваецца пры дапамозе інфармацыйнага рэсурсу (яго складовай часткі), размешчанага ў глабальнай камп'ютарнай сетцы інтэрнэт, вызначаецца спецыяльна ўпаўнаважаным дзяржаўным органам у сферы бяспекі выкарыстання нацыянальнага сегмента глабальнай камп'ютарнай сеткі інтэрнэт сумесна з Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь.».

**Артыкул 2.** Гэты Закон прымяняецца да праваадносін, якія ўзнікнуць пасля яго ўваходжання ў сілу, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных часткамі другой і трэцяй гэтага артыкула.

Сродкі масавай інфармацыі, зарэгістраваныя да ўваходжання ў сілу гэтага Закона, маюць права ажыццяўляць дзейнасць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з улікам патрабаванняў, вызначаных для заснавання і дзяржаўнай рэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі да ўваходжання ў сілу гэтага Закона, пры ўмове, што рэдакцыямі названых сродкаў масавай інфармацыі з'яўляюцца:

юрыдычныя асобы (камерцыйныя арганізацыі), у статутным фондзе якіх доля замежных інвестараў складае 20 і больш працэнтаў;

юрыдычныя асобы (некамерцыйныя арганізацыі), 20 і больш працэнтаў заснавальнікаў (удзельнікаў, членаў) якіх складаюць замежныя юрыдычныя асобы, замежныя грамадзяне і (або) асобы без грамадзянства, якія пастаянна не пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Распаўсюджвальнікі прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі, якія на дзень уваходжання ў сілу гэтага Закона ажыццяўляюць распаўсюджванне прадукцыі друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, а таксама прадукцыі тэлевізійных, радыёвяшчальных сродкаў масавай інфармацыі, абавязаны да 1 ліпеня 2015 года накіраваць у рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі звесткі, неабходныя для ўключэння іх у Дзяржаўны рэестр распаўсюджвальнікаў прадукцыі друкаваных сродкаў масавай інфармацыі і Дзяржаўны рэестр распаўсюджвальнікаў прадукцыі тэлевізійных і радыёвяшчальных сродкаў масавай інфармацыі адпаведна. Накіраванне гэтых звестак ажыццяўляецца ў паведамляльным парадку на электронны адрас рэспубліканскага органа дзяржаўнага кіравання ў сферы масавай інфармацыі.

**Артыкул 3.** Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у шасцімесячны тэрмін:

прывесці рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

забяспечыць прывядзенне рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, падпарадкаванымі Ураду Рэспублікі Беларусь, іх нарматыўных прававых актаў у адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя захады, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

**Артыкул 4.** Гэты Закон уваходзіць у сілу з 1 студзеня 2015 года.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА**
*20 снежня 2014 года, г. Мінск.*
*№ 213—З*

# СПРАВА РУК ЧАЛАВЕЧЫХ

## Культуру ствараюць людзі, а яна потым стварае іх

**Гукі свістулек напаўнялі прастору, галасы беларускіх дуд ажывалі ў свядомасці, калі бачыла стэнд з музычнымі інструментамі. Карціну дапаўнялі людзі ў гістарычных строях. А яшчэ вы б пачулі, якім чынам новыя тэхналогіі (напрыклад, 3D-мадэлі помнікаў архітэктуры) могуць дапамагчы ў ажыўленні музейных экспазіцый! Тут нікога нічым не здзівіць, бо на размову сабраліся тыя, хто выводзіць формулы здзіўлення для іншых пры знаёмстве з беларускай культурай у яе паглыбленні. Людзі навукі і тыя, хто за культуру адказваюць, прыйшлі зацікаўлена пагаварыць у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

На сумесным пасяджэнні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ішла гаворка пра самае важнае: «Культура — ідэйная аснова беларускай дзяржаўнасці». З гэтай думкай ажыццяўлялася прагарама навуковага супрацоўніцтва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на 2010-2015 гады. Цяжка без навуковай глебы ствараць адзіную культурную прастору, дзе хутка мяняюцца ўмовы існавання народаў: гэта ўплывае на выбар прыярытэтаў. Але ёсць з'явы, непадуладныя часу, якія сведчаць пра менавіта чалавечы характар культуры, праяўляючы наш свет ва ўсім яго стракатым багацці. А тут адразу, можа, і не заўважыш і не скажаш, пакуль разумныя людзі не патлумачаць. Яны і сведчаць пра фарміраванне інфармацыйнага грамадства, пра тэндэнцыю да глабалізацыі культур, але і ведаюць, як за вялікім не страціць адметнае лакальнае, створанае асобным народам, падкрэсліць яго вартасці і, калі ёсць магчымасць, прывабіць прадстаўнікоў іншых культур — не падобнае ні на кога заўсёды цікава.

### САБЕ

На думку **старшыні прэзідыума НАН Беларусі Уладзіміра ГУСАКОВА**, прагарама рэалізуецца даволі эфектыўна, асабліва ў тых сферах, якія задаюць кірункі развіцця культуры: напрыклад, у заканатворчай дзейнасці, у плане экспертных заключэнняў, калі гаворка ідзе пра наданне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці аб'екту нацыянальнай спадчыны. Некаторыя этапы супрацоўніцтва праявіліся ў канкрэтных праектах. Натуральна, прыслухоўвацца да экспертаў-навукоўцаў трэба, калі гаворка пра лёс гістарычных аб'ектаў, і асабліва археалагічных помнікаў ці помнікаў нематэрыяльнай культуры. Як паведаміў **міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ**, пры падтрымцы ЮНЕСКА Інбелкультам быў створаны Нацыянальны інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі і сайт «Жывая спадчына», распрацавана практычнае кіраўніцтва да ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Спецыялісты Інбелкульта даследуюць стан аб'ектаў спадчыны, даюць экспертныя заключэнні на абрады разам з супрацоўнікамі акадэміі навук. Створаны дзяржаўны каталог музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. На 10 снежня ў дзяржаўны каталог перададзены звесткі пра больш як 148 тысяч асабліва каштоўных музейных прадметаў. У тым ліку ў 2014 годзе аб 11 876 музейных прадметах. У музейны фонд уключаюцца прадметы ўсіх дзяржаўных музеяў, а таксама могуць быць уключаны рарытэты прыватных музеяў — па іх пісьмовай заяве. Але такіх заяў ад прыватных музеяў не паступала, паводле слоў міністра.

Але ці не самы цікавы праект — калі тое, што клапоціць навукоўцаў, пачынае клапаціць прадстаўнікоў органаў дзяржаўнага кіравання.

— Прагарама навуковага супрацоўніцтва была прынята ў 2010 годзе, — паведаміў Барыс Святлоў. — Спецыялісты-навукоўцы ўдзельнічалі ў абмеркаванні праекта Кодэкса Рэспублікі Беларусь «Аб культуры». Выкананне мерапрыемстваў спрыяла ўдасканаленню кадравага патэнцыялу ў сферы культуры. Відавочна, што аб'яднаны патэнцыял культуры і навукі выкарыстаны яшчэ не ў поўнай меры.

### І ЛЮДЗЯМ

А час усё падкідвае новыя задачы. Адна з іх — упісаць сваю культуру ў абшары агульначалавечай. І тут важна зразумець, якім чынам яе ўзбагачае мастацкая сфера, якая сёння развіваецца ў супрацьстаянні з прадуктамі масавай культуры.

**Аляксандр ЛАКОТКА, дырэктар дзяржаўнай навуковай установы Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук**, адзначыў:

— Патрэбна новая ідэалагічная парадыгма, сутнасць якой заключаецца ў паразуменні адзінства культуры традыцыйнай і прафесійнай, элітарнай, этнічна разнастайнай. Асновай нацыянальнай культуры ва ўсіх сферах яе функцыянальнага развіцця з'яўляецца беларуская мова. Беларуская нацыянальная культура мае рэгіянальную разнастайнасць, што патрабуе захавання мясцовых культурных традыцый, арганічнага суіснавання нацыянальных і рэгіянальных культурных рыс, развіцця формаў і спосабаў трансляцыі рэгіянальных культур... Дэмаграфічны крызіс, эканамічны спад паставілі еўрапейскія краіны перад праблемай абароны нацыянальных і духоўных культурных каштоўнасцяў. Сёння задачамі ААН, Еўрасаюза ў сферы аховы і развіцці культурнай разнастайнасці свету павінен стаць працяг работы па захаванні нацыянальных моў і дыялектаў, аховы песеннай і вуснапаэтычнай культурнай спадчыны народаў і этнічных груп. Развіццё культурнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Еўрасаюзам паспрые ў тым ліку і культурнаму ўзбагачэнню Еўропы, многія культурныя карані якой бяруць пачатак з беларускай зямлі.

На думку кіраўніка Цэнтра беларускай культуры, мовы і літаратуры, дзеля інавацыйнага развіцця культуры як асновы суверэнітэту і нацыянальнай ідэнтычнасці неабходна вырашэнне наступных праблем: развіццё мастацтвазнаўчых навуковых школ і падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, асабліва ў такіх галінах, як ахова, рэстаўрацыя помнікаў гісторыі і культуры, сучасная мастацкая культура. Выкарыстанне нацыянальнай культурнай спадчыны ў сферы турызму — гэта важны фактар развіцця рэгіёнаў, стварэнне свабодных эканамічных зон, новых працоўных месцаў, фарміраванне мясцовай інфраструктуры. Ён жа прапанаваў на месцы старога будынка музея Вялікай Айчыннай вайны на Кастрычніцкай плошчы пабудаваць Музей беларускай дзяржаўнасці. Ён бы ўпісаўся ў прастору Палаца Рэспублікі, Палаца прафсаюзаў ды ў ансамбль праспекта Незалежнасці. Дзяржаўнасць і незалежнасць — рэчы, здаецца, непарыўныя.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**


РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

**«ГИППО + Махеев. Вкусно каждый день!»**

Игра проводилась с 02.10.2014 по 26.12.2014. В игре приняли участие 2080 человек.

Призовой фонд был разыгран полностью.

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Студия Пушкаревой», УНП 192215032, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 14 февраля 2014 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №192215032 (далее – Организатор). Местонахождение Организатора: 220050, г. Минск, ул. Комсомольская, д. 18, комн. 206 «А».

Заинтересованным лицом является Общество с ограниченной ответственностью «Владпродимпорт», зарегистрированное 25 июля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101308387; местонахождение: 220036, г. Минск, ул. Западная, 11 «А», УНП 101 308 387 (далее – Заинтересованное лицо).

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 2423, зарегистрированной 02.09.2014 г., выдано Министерством торговли Республики Беларусь.

**Главный приз:**
Изготовление и монтаж кухни по индивидуальному дизайн-проекту выиграла Секан Татьяна Владимировна из г. Минска.

**Системы очистки воды «АО», AO RO 6 выиграли:**
1. Колобова И.В., г. Минск
2. Сильванович Т.П., г. Минск
3. Миргоровская Е.В., г. Минск
4. Янковская Н.В., г. Минск
5. Безуглый В.И., г. Минск

**Блендеры BOSCH MSM6B150 выиграли:**
1. Тарасюк Т.И., г. Минск
2. Черняк О.А., г. Минск
3. Держицкая Е.В., г. Гомель
4. Юшкова Л.А., г. Минск
5. Кунай С.Ю., г. Гомель
6. Шидловская Т.А., г. Минск
7. Буйко А.В., г. Минск
8. Боброва О.Н., г. Минск
9. Паращенко Л.М., г. Минск
10. Адаманис Е.А. г. Гомель
11. Фурс Т.В., г. Минск
12. Сукманова М.А., г. Минск
13. Белых О.М., г. Минск
14. Нестерова Т.Б., г. Минск
15. Тунчик А.В., г. Минск
16. Хамко Т.П., г. Минск
17. Орлова Л.Г., г. Минск
18. Моисеева В.С., г. Минск
19. Веретенникова И.М., г. Могилев
20. Асташевич С.Н., г. Минск
21. Дроздова Н.А., г. Гомель
22. Горбачева С.В., г. Гомель
23. Толмачева А.А., г. Минск
24. Немчинов Д.Ю., г. Минск
25. Деменева Е.И., г. Минск
26. Миргоровская Е.В., г. Минск
27. Гесть А.Д., г. Минск
28. Марочкина Т.А., г. Гомель
29. Ломоносова Е.Л., г. Гомель
30. Максакова И.М., г. Могилев
31. Борисова Л.С., г. Минск
32. Авласенко И.В., г. Минск
33. Телешик О.А., г. Минск
34. Суббот-Хлыщенкова М.В., г. Минск
35. Чернов А.А., г. Минск
36. Дорошков С.В., г. Могилев
37. Соколова А.В., г. Минск
38. Коваленко Н.Ю., г. Минск
39. Перлин Д.В., г. Минск
40. Дамашевич С.А., г. Минск
41. Захаренкова И.И., г. Минск
42. Манько Т.Н., г. Минск
43. Иванченко В.А., г. Минск
44. Жилач Ю.Н., г. Минск
45. Шарупо Т.В., г. Минск
46. Щекотихина Л.В., г. Минск
47. Павленко С.Н., г. Минск
48. Лазаренко И.М., г. Могилев
49. Соловей Д.С., г. Минск
50. Барановская И.Б., г. Минск
51. Цаба В.В., г. Минск
52. Копейкин К.В., г. Минск
53. Бухтаревич Н.С., г. Минск
54. Макаревич В.Л., г. Гомель
55. Бородич А.В., г. Минск
56. Бирюк А.И., г. Минск
57. Горбунов А.С., г. Минск
58. Маренкова М.Г., г. Минск
59. Дерюгина И.Л., г. Могилев
60. Журавский В.М., г. Могилев
61. Антихевич А.А., г. Могилев
62. Ксендзов А.А., г. Гомель
63. Ищенко С.С., г. Могилев
64. Иосифов К.С., г. Могилев
65. Мартинович Л.К., г. Минск
66. Юденич О.А., г. Минск
67. Дорофеева С.А., г. Гомель
68. Комедько С.В., г. Минск
69. Стрельская Е.И., г. Минск
70. Теплякова О.В., г. Могилев
71. Римко А.А., г. Минск
72. Климова О.Г., г. Минск
73. Кондратенко В.П., г. Могилев
74. Гришанович Е.Н., г. Минск
75. Сакович О.Б., г. Минск
76. Новиткевич Т.Л., г. Минск
77. Мишенькин В.Н., г. Минск
78. Геращенко А.С., г. Гомель
79. Римашевская Н.Г., г. Минск
80. Старикович Т.В., г. Минск
81. Гусакова Т.А., г. Могилев
82. Крупенко О.Г., г. Могилев
83. Белясов С.П., г. Минск
84. Ковалева О.М., г. Минск
85. Заливако Е.М., г. Минск
86. Янцевич О.С., г. Минск
87. Разводовская И.Н., г. Минск
88. Тихон И.И., г. Минск
89. Иваницкая И.Н., г. Минск
90. Борис С.Н, г. Могилев
91. Матеюк К.П., г. Минск
92. Хурс В.А., г. Минск
93. Симакова Л.Н., г. Минск
94. Борисенко Н.П., г. Минск
95. Насевич Т.Н., г. Минск
96. Минчукова О.М., г. Минск
97. Гопанович М.В., г. Минск
98. Перевалова Т.Н., г. Минск
99. Иванова Т.Г., г. Минск
100. Спиридонова А.М., г. Минск

Победители могут явиться **23 декабря 2014 года к 19.00** в магазин «ГИППО» по адресу г. Минск, ул. Горецкого, 2 на торжественную церемонию, посвященную вручению сертификатов на получение призов (при себе иметь паспорт и кассовый чек (оригинал), подтверждающий покупку).

■ Нашы праекты

# «СКРОЗЬ «МАЛАДОСЦЬ» — У ЛІТАРАТУРУ

## «ЧАМАДАН З КРАКАДЗІЛАВАЙ СКУРЫ» І НЕ ТОЛЬКІ — У АДНОЎЛЕНАЙ КНІЖНАЙ СЕРЫІ

**Заўсёды прыемна адкрываць для сябе новыя імёны ў айчыннай літаратуры. Гартаць кнігі сучаснікаў, напісаныя, як кажуць, трымаючы руку на пульсе часу, улічваючы запатрабаванні чытачоў. У нейкім сэнсе такія творы на вагу золата, бо штосьці могуць нам расказаць пра сённяшні дзень, нешта патлумачыць. «Але дзе можна іх прачытаць?» — спытаеце вы. Адказ вельмі просты — у кніжнай серыі «Бібліятэка часопіса «Маладосць».**


**Віктар Лупасін** *(злева)*, **Алёна Беланожка, Уладзімір Мажылоўскі.**

Серыя была заснавана яшчэ ў 1988 годзе, але пэўны час кнігі выходзілі не перыядычна. Цяпер жа дзякуючы Выдавецкаму дому «Звязда» яна атрымала новае жыццё, а маладыя аўтары — магчымасць выдаць свае першыя кнігі.

Пачалася «Бібліятэка часопіса «Маладосць» кнігай, створанай яе галоўным рэдактарам **Святланай Дзянісавай,** і мае назву **«Скрозь «Маладосць».** Тут адлюстравана гісторыя выдання: самае цікавае з яго працоўна-творчых будняў, дружнае жыццё рэдакцыйнай каманды, найбольш яскравыя аўтары. Але кніга будзе цікавая і тым, хто не надта знаёмы з «Маладосцю», бо ў ёй выразна вымалёўваюцца дзве розныя эпохі — савецкай Беларусі і сучаснай, незалежнай краіны. У абодва перыяды часопіс займаў годнае месца сярод айчыннай перыёдыкі. Чытаючы гэту кнігу, але грунтуючыся на ўласным вопыце, цікава адчуць тыя акцэнты, якія праз колькі дзесяцігоддзяў расставіў сам час, па-новаму зірнуць на даўно мінулыя падзеі.


Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

На прэзентацыі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі кнігу «Скрозь «Маладосць» эпатажна прадставіў супрацоўнік часопіса, паэт Віктар Лупасін. Каб заінтрыгаваць чытачоў, некаторыя тэмы, раскрытыя ў кнізе, ён падаў у вершах. Так, з яго вуснаў мы даведаліся, што ў той год, калі памёр Сталін, наш паважаны прафесар, актыўны дзеяч беларускай культуры Адам Мальдзіс быў студэнтам. А пра тое, як малады Мальдзіс выратаваў мужчынскую палову свайго курса ад рэпрэсій, паэт параіў нам прачытаць у выданні «Скрозь «Маладосць»…

Яшчэ адна кніга з гэтай серыі, якую напісала малады аўтар **Алёна Беланожка,** называецца **«Чамадан з кракадзілавай скуры».** На сустрэчы з чытачамі пісьменніца распавяла, якім чынам яе аповесць пабачыла свет. Спачатку тэкст быў напісаны на рускай мове. Але аднойчы дзяўчына прачнулася сярод ночы і зразумела: трэба тэрмінова перапрацаваць твор, іначай ён назаўсёды так і застанецца ляжаць у стале. Яна пераклала яго на беларускую мову і… скараціла ў тры разы. А пасля, як прызналася аўтар, разаслала ў розныя выдавецтвы — так шанцы быць выдадзенай хоць дзесьці значна павялічваліся. Ёй прыйшоў адказ з «Маладосці». Аповесць спачатку надрукавалі ў некалькіх нумарах запар, а пасля выдалі ў аднаўленай кніжнай серыі.

«Чамадан з кракадзілавай скуры» — авантурна-прыгодніцкая аповесць. Яе героі — маладыя людзі, якія працуюць у сферы шоу-бізнесу. Яны заняты здымкамі кліпа для сучаснага гурта. Не могучы знайсці паразумення, б'юць посуд, сувенірныя статуэткі, робяць рамонты ў сваім офісе, бачаць, як адзінарог з малюнка, што вісіць на сцяне, раптам пачынае ім падміргваць. Але жарсці напаляюцца яшчэ больш, калі аднаму з іх тэлефануюць незнаёмыя і патрабуюць тэрмінова вярнуць 5 мільёнаў еўра…

Трэцяя кніга з гэтай серыі — **«Праклён мітрапаліта Феафіла»,** напісаная празаікам з-пад Браслава **Уладзімірам Мажылоўскім.** «Звязда» падрабязна пісала пра гэты твор і яго аўтара ў нумары за 27 лістапада. Нагадаем толькі, што ў кнізе змешчана некалькі гістарычных аповесцяў, а самога аўтара некаторыя яго прыхільнікі параўноўваюць з Уладзімірам Караткевічам.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Афіша

# ЦЫРК ПРАДСТАЎЛЯЕ

## Нацыянальны каларыт з экзотыкай

**Днямі Беларускі дзяржаўны цырк прэзентаваў мінчанам і гасцям сталіцы новую праграму «Чароўны сон у зімнюю ноч». У атмасферы свята спалучылася цыркавое мастацтва, музыка, харэаграфія і беларускі каларыт з легендамі, гісторыяй нашай зямлі. На падрыхтоўку праграмы спатрэбілася дзевяць месяцаў.**



Пасля навагодніх выступленняў артысты адправяцца ў нядоўгі адпачынак, а потым ужо запланаваны гастролі цырка ў Кіеў, Баку, напэўна ў Маскву і іншыя гарады.

— Гэта першая наша праграма, але пробны крок па яе дэманстрацыі мы зрабілі, калі пасля дзевяці месяцаў працы адправілі пастаноўку для паказу ў Сімферопаль. Яна была паспяхова адаптавана і цёпла прынята публікай. Гэта быў добры зачын для таго, каб артысты адчулі плячо і сваю запатрабаванасць, — адзначыў на сустрэчы з журналістамі **дырэктар Белдзяржцырка Уладзімір ШАБАН.**

У праграме прадстаўлена багатая палітра цыркавых нумароў у выкананні лепшых беларускіх артыстаў: жанглёраў, гімнастаў на турніках, вершнікаў, акрабатаў, эквілібрыстаў, паветраных і сілавых гімнастаў, а таксама дрэсіраваных коней, вярблюдаў, лам і сабачак. Спецыяльна для спектакля былі створаны новыя цыркавыя нумары, напісана музыка, а таксама падрыхтавана вялікая колькасць касцюмаў і цыркавога рэквізіту.

Паказ новай праграмы працягнецца да 14 студзеня. Але квіткі ўжо раскуплены, таму, відаць, усім, хто не паспеў запасціся білецікам, варта чакаць іншага разу.


Фота БЕЛТА.

**Мастацкі кіраўнік Белдзяржцырка, аўтар сцэнарыя і рэжысёр-пастаноўшчык новай праграмы Вітаўтас ГРЫГАЛЮНАС** адзначае: у пастаноўцы «Чароўны сон у зімнюю ноч» на манежы будуць выключна беларускія артысты. «Палова з іх — маладыя, яны прыйшлі да нас і робяць свае першыя крокі. Будзе паказаны патэнцыял нашага цырка. І такі сплаў вопыту і маладосці, мне здаецца, дасць свой плён… Наша прынцыповая пазіцыя была ў тым, каб беларускі цырк меў сваю нацыянальную праграму».

Пастаноўкай цыркавых нумароў і трукаў займалася **галоўны рэжысёр Белдзяржцырка Ала НІКАЛАЕВА-АЛІЕВА.** «Для стварэння гісторыі патрэбна фантазія, а вось увасобіць яе ў рэальнасць — справа чалавечага жадання, фізічных сіл і эмоцый. І сёння мы справіліся. Атрымаліся цікавыя нумары, іх адаптавалі да музыкі, якую прапанаваў кампазітар, да касцюмаў і гісторыі. Для многіх артыстаў работа ў гэтай праграме стала новым крокам, бо салісты працуюць у групах, выступаюць у новых для сябе жанрах і адкрываюць сябе з новых ракурсаў».

Праграма, аснову якой складае паглыбленне ў сны, адлюстроўвае беларускі дух з яго гісторыяй, паданнямі і легендамі, але не абышлося і без экзотыкі. А вось з 30 студзеня гледачы ўбачаць на арэне Белдзяржцырка шоу гіганцкіх фантанаў. Пра квіткі, мабыць, варта падумаць загадзя. Прыемных вам праглядаў.

**Алена ДРАПКО**

Рынкавая эканоміка

БЕЛЭКСИМГАРАНТ
EXIMGARANT OF BELARUS

# «НАШ ЭКСПАРЦЁР ЗАЎСЁДЫ НАДЗЕЙНА АБАРОНЕНЫ»

## Філіял «Белэксімгарант-Гродна» нарошчвае паслугі прадпрыемствам, што працуюць на замежных рынках





**Беларускае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант» — адна з буйнейшых страхавых кампаній краіны. Створана ў 2001 годзе для падтрымкі прадукцыі і паслуг айчынных прадпрыемстваў на сусветным рынку. Фундатар — урад краіны. Мае разгалінаваную сетку філіялаў. Сёння наш расказ пра філіял у Гродне.**

**У калектыўнай гутарцы з карэспандэнтам «Звязды» прынялі ўдзел дырэктар філіяла Сяргей ЛАЎРУШКА і яго намеснікі Святлана АНІСЬКА і Аляксандр СЛІЎКО.**

У самым пачатку Сяргей Яўгенавіч Лаўрушка палічыў патрэбным падкрэсліць:

— Нашаму філіялу споўнілася 12 гадоў. Адразу тут працавалі тры чалавекі, цяпер — больш за дзвесце. Мы шматпрофільнае прадпрыемства, але асноўных кірункаў работы тры. Першы і галоўны — страхаванне экспартных рызык. Другі — развіццё медыцынскіх паслуг. І трэці — традыцыйныя віды страхавання: абавязковае (75%) і добраахвотнае (25%). Гэта страхаванне грамадзянскай адказнасці тых, хто за рулём, страхаванне перавозчыкаў, маёмасці, транспарту, грузаў, крэдытаў, аблігацый... Усяго мы ажыццяўляем 55 відаў страхавання. І аб'ём сваіх паслуг стараемся нарошчваць.

Але сёння давайце спынімся на галоўным кірунку — страхаванні экспарту. На развіццё гэтага віду паслуг мы сканцэнтравалі намаганні ўсяго свайго калектыву. Ёсць аб'ектыўныя фактары, з якімі павінны лічыцца: па-першае — самая маленькая вобласць. І па структуры прамысловасці — у нас у асноўным пераважае перапрацоўка: масласырзаводы і мясакамбінаты. Акрамя гэтага, некаторыя «шчаслівчыкі» працуюць па папярэдняй аплаце — напрыклад, ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» і ААТ «Лідскае піва» . Заявак у іх шмат, магутнасці загружаны, таму перайшлі на папярэднюю аплату, і страхавое пакрыццё рызык ім не патрэбна.

Тым не менш кліенцкая база дастатковая. Працуем як з дзяржаўнымі, так і з прыватнымі прадпрыемствамі. Сярод іх такія вядомыя за межамі Беларусі калектывы, як ААТ «Гродна-Азот», СТАА «Контэ Спа», ААТ «Скідальскі цукровы камбінат», ААТ «Лакафарба» з Ліды, ваўкавыскія ААТ «Беллакт», ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» і ААТ «Ваўкавыскі мясакамбінат», ААТ «Лідскі малочнакансервавы камбінат», ААТ «Шчучынскі масласырзавод» і гэтак далей. Пералік дастаткова вялікі — летась было 20 прадпрыемстваў, зараз гэтая лічба вырасла ў 1,5 раза. Услед за абласным цэнтрам і такімі буйнымі гарадамі, як Ліда, пашыраем супрацоўніцтва з раённымі цэнтрамі — Навагрудкам, Ашмянамі і іншымі.

Радуе, што намецілася такая вось станоўчая дынаміка. Дырэктарскі корпус пачынае разумець, што не варта выпрабоўваць лёс, а лепш карыстацца нашай падтрымкай. Толькі за дзесяць месяцаў заключана 1899 дагавораў страхавання і тэмп прыросту ў параўнанні з леташнім склаў 32%.

### Прадстаўляем інтарэсы дзяржавы

Сваю работу калектыў будуе адпаведна з Указам Прэзідэнта РБ № 534 ад 25 жніўня 2006 года «Аб садзейнічанні развіццю экспарту тавараў (работ, паслуг)». Дакументам прадугледжаны як асноўныя, так і дадатковыя паслугі. Асноўныя — гарантаванне эканамічнай бяспекі экспарцёра шляхам выплаты страхавога пакрыцця і ўрэгулявання страт у выніку наступлення страхавога выпадку. Дадатковыя — кваліфікаваная кансультатыўная дапамога экспарцёру на стадыі заключэння знешнегандлёвых кантрактаў і іх суправаджэння. А таксама пастаянны маніторынг фінансавага стану, дзелавой актыўнасці і знешняга асяроддзя контрагента (замежнага пакупніка).

— Пачынаючы з 2011 года, пачалося больш актыўнае выкарыстанне другога інструмента, які прадугледжаны ва Указе, — экспартнага крэдытавання экспарцёраў банкамі, — расказвае Аляксандр Сліўко. — Гэтая паслуга ў вобласці, як і ў цэлым у краіне, развіваецца зараз дастаткова актыўна. У нас летась было ажыццёўлена адзінаццаць праектаў па экспартным крэдытаванні. Сёлета, спадзяюся, будзе больш. Усё залежыць ад таго, ці гатовы банкі прадастаўляць крэдытныя рэсурсы ў дадзены момант, які з'яўляецца зусім не простым.

Тут патрэбна патлумачыць. Менавіта «Белэксімгарант» і яго філіялы валодаюць выключным правам страхавання экспартных рызык з падтрымкай дзяржавы. І сутнасць дзяржаўнай падтрымкі заключаецца яшчэ і ў тым, што ў бюджэце краіны штогод прадугледжваюцца сродкі на кампенсацыю страт, панесеных банкам ад прадастаўлення экспартных крэдытаў. Прадугледжаны таксама бюджэтныя пазыкі для выплаты пры неабходнасці страхавога пакрыцця — па дагаворах страхавання. Падкрэслім: у абодвух выпадках толькі пры ўмове страхавання экспартных аперацый у Белэксімгаранце.

— Лічым, што гэты кірунак з'яўляецца вельмі перспектыўным, — перакананы Аляксандр Раманавіч. — Наша работа дапамагае прадпрыемствам адчуваць сябе больш упэўнена на знешніх рынках, замацоўваць свае пазіцыі і рухацца далей, заваёўваць новыя пазіцыі. Мяркуйце самі: за кошт атрыманага таварнага крэдыту можна элементарна павялічыць продаж. Дзякуючы крэдытаванню зніжаецца сабекошт прадукцыі і, адпаведна, павышаецца рэнтабельнасць. Значыць, лягчэй канкурыраваць з іншымі таваравытворцамі, бо ёсць магчымасць прапанаваць больш выгадныя ўмовы рэалізацыі. І ў выніку прадпрыемства прыносіць краіне больш валютнай выручкі, чым яно магло атрымаць без карыстання фінансавымі інструментамі.



— На самой справе колькасць плюсоў большая, — удакладняе Сяргей Лаўрушка. — Дзе ты ў іншым месцы возьмеш валютны крэдыт пад тры працэнты? Няма больш такога. Тым больш, што зараз працэдура крыху спрашчаецца, каб максімальна скараціць час ад падачы заяўкі да атрымання крэдыту. Таксама страхаваннем з адтэрміноўкай плацяжу дырэктар здымае з сябе велізарны груз адказнасці за невяртанне валютнай выручкі. А гэтая пазіцыя, як вядома, пастаянна знаходзіцца пад пільнай увагай нашых кантралюючых органаў. І не патрэбна пастаянна ездзіць у сталіцу, каб прадаўжаць тэрміны вяртання валютнай выручкі. Калі кантракт застрахаваны ў Белэксімгаранце, то тэрміны прадаўжаюцца аўтаматычна.

— Пачаўшы ў свой час з нуля, зараз мы займаем па экспартным страхаванні адну з лідзіруючых пазіцый, — зазначае Аляксандр Сліўко. — Гэта нягледзячы на тое, што наша вобласць не лідзіруе па экспарту сярод іншых рэгіёнаў. Нашы паслугі патрэбны як буйному, так і невялікаму экспарцёру. Яны ўніверсальныя па сваім характары і прызначэнні, накіраваны на тое, каб зніжаць рызыкі, а яны ёсць ва ўсіх.

Гэты год выдаўся складаным для экспарцёраў. Да 60% экспарту прадпрыемстваў вобласці прыпадае на Расійскую Федэрацыю, а з канца другога квартала ідзе рэзкае зніжэнне курса расійскага рубля, і ў выніку аб'ём экспарту расце, а ў доларавым эквіваленце зніжаецца. Ва ўсе папярэднія гады экспарт павялічваўся, працэнт яго пакрыцця нашымі паслугамі — таксама. Мы разлічваем, што ў гэтым годзе вырастуць і колькасць прадпрыемстваў, якія працуюць з намі, і колькасць кантрактаў, якія мы прымаем на страхаванне. Ці адбудзецца рост у доларавым эквіваленце, пакажа год — у залежнасці ад таго, якім будзе курс рубля. Што датычыцца нас, то дынаміка па ўсіх паказчыках станоўчая. Аб'ём страхавога пакрыцця экспартных кантрактаў расце. Нягледзячы на тое, што шэраг прадпрыемстваў вобласці скараціў аб'ёмы экспартных паставак па прычынах, якія называліся вышэй, збіраемся не змяншаць аб'ёмныя паказчыкі, на якія выйшлі ў больш спрыяльны перыяд.

### Клопат пра чалавека працы

— Другім ключавым напрамкам дзейнасці філіяла «Белэксімгарант-Гродна», які атрымаў імклівае развіццё, з'яўляецца добраахвотнае страхаванне медыцынскіх выдаткаў, — уключаецца ў размову Святлана Аніська. — Сэнс гэтай паслугі ў тым, што, заключыўшы дагавор добраахвотнага страхавання медыцынскіх выдаткаў, «Белэксімгарант» бярэ на сябе абавязацельствы па арганізацыі і аплаце медыцынскіх паслуг, прадстаўленні інтарэсаў застрахаваных перад лячэбнай установай, а таксама па ажыццяўленні кантролю, тэрмінаў і якасці медыцынскіх паслуг, узроўню камфортнасці і сервісу пры атрыманні медыцынскай дапамогі. Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 219 ад 12 мая 2005 года прадпрыемствы-страхавальнікі маюць права аднесці ўзносы па добраахвотным страхаванні медыцынскіх расходаў на затраты па вытворчасці і рэалізацыі тавараў, а ў адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў РБ ад 6 студзеня 2006 года на сумы страхавых узносаў не налічваюць узносы па дзяржаўным сацыяльным страхаванні ў фонд сацыяльнай абароны.

З мэтай якаснага абслугоўвання кліентаў у філіяле «Белэксімгарант-Гродна» працуюць урачы, якія кансультуюць людзей 24 гадзіны ў суткі 7 дзён у тыдзень. Добраахвотнае страхаванне медыцынскіх выдаткаў не толькі павышае прэстыжнасць працоўных месцаў і аўтарытэт працадаўцы на рынку працы, але і значна скарачае страты працоўнага часу, выкліканыя хваробамі супрацоўнікаў. Да пераваг гэтага віду страхавання можна аднесці беспярэшкодны доступ да дарагіх відаў абследавання і лячэння, багаты выбар фізіятэрапеўтычных працэдур, кансультацыі вядучых спецыялістаў, знаходжанне ў стацыянары ў палатах павышанай камфортнасці.

Рахунак за свае паслугі медыцынская ўстанова выстаўляе Белэксімгаранту, а кошт такой паслугі для прадпрыемства — ад 600 тысяч да 1,5 мільёна беларускіх рублёў, у залежнасці ад выбранай праграмы. А яны розныя: абслугоўванне толькі ў паліклініках альбо і ў стацыянарах, абслугоўванне толькі ў дзяржаўных медыцынскіх установах альбо ўключаны прыватныя медыцынскія цэнтры і гэтак далей.

Калі гаварыць пра нейкія праблемы, то яны ўзнікаюць тады, калі на прадпрыемстве расходы па добраахвотным медыцынскім страхаванні не ўключаны ў калектыўныя дагаворы ці наогул не прадугледжаны каштарысам расходаў. А медыцынскім установам варта размяркоўваць сродкі ад страхавання такім чынам, каб ва ўрачоў была матывацыя працаваць з пацыентамі, якія прыйшлі да іх па страхоўцы. І вызначыць каардынатараў, якія адказвалі б за работу са страхавымі кампаніямі. Краіна рухаецца да абавязковага медыцынскага страхавання, і мы сёння набываем патрэбны вопыт.

Развіваем таксама страхаванне тых, хто едзе за мяжу, — працягвае Святлана Мікалаеўна. — Зараз адкрываюцца новыя візавыя цэнтры, і мы шукаем шляхі супрацоўніцтва з польскімі і літоўскімі консульствамі, каб атрымаць акрэдытацыю і працаваць сумесна. Дзякуючы гэтаму нашы грамадзяне атрымаюць надзейную медыцынскую дапамогу падчас замежных камандзіровак ці турыстычных паездак. Ужо сёння супрацоўнічаем з некалькімі буйнымі асісціруючымі кампаніямі, якія прадстаўляюць нашы інтарэсы за мяжой.

### Перспектывы

— Наша практыка ў падтрымку экспарцёраў, якая пачала ажыццяўляцца ў 2006 годзе, пастаянна дэталізуецца і ўдасканальваецца, — падводзіць вынік размове дырэктар. — Дабаўляюцца нейкія новыя кірункі дзейнасці. Напрыклад, два гады таму, калі быў створаны ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь», уведзена норма аб крэдытаванні нерэзідэнтаў для разлікаў з экспарцёрамі менавіта праз гэты банк. Прыменена больш спрошчаная працэдура, чым праз іншыя банкі, што дае экспарцёру адчувальны выйгрыш у часе. А ў гэтым годзе з'явіўся экспартны фактарынг. Да валютнага крэдытавання дабавілася крэдытаванне спачатку ў беларускіх, а затым і ў расійскіх рублях. Няхай само прадпрыемства выбірае, як яму больш зручна.

У рамках нашай кампетэнцыі пастаянна ўдасканальваем сваю нарматыўна-прававую базу. Калі кліент нечым незадаволены, стараемся палепшыць свой прадукт, і таму бачым перспектыву.

Мы прадастаўляем зараз страхавое пакрыццё сваім кліентам у Расіі, Казахстане, Арменіі, Малдове, Прыбалтыцы. Летась была яшчэ Украіна. Ёсць вопыт страхавога пакрыцця па такіх не простых краінах, як Сірыя, Таджыкістан, Кыргызстан. Летась адбыўся страхавы выпадак па Сірыі, і мы змаглі вярнуць страхавое пакрыццё. Так што калі ў экспарцёраў ёсць інтарэсы і ў краінах так званай «далёкай дугі», мы гатовы працаваць разам.

**Публікацыю падрыхтавалі Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ і Уладзімір БЯРЭЗІН. Здымкі прадастаўлены філіялам.**

Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) 02200/13 — 00049 на права ажыццяўлення страхавой дзейнасці. Выдадзены Міністэрствам фінансаў РБ. Сапраўдны да 23.04.2018 г. УНП 101421509.

ДЭПАРТАМЕНТ ПА КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь
ЗАВЕРАНА 19 снежня 2014
Прозвішча Пкагацкая В.В.
Подпіс

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ
## ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ
открытого акционерного общества «Белагропромбанк» для юридических лиц
сто девяносто четвертого, сто девяносто пятого, сто девяносто шестого выпусков

**1. Наименование эмитента:**

а) полное наименование:

на белорусском языке – адкрытае акцыянернае таварыства «Белаграпрамбанк»;

на русском языке – открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (далее – Банк);

б) сокращенное наименование:

на белорусском языке – ААТ «Белаграпрамбанк»;

на русском языке – ОАО «Белагропромбанк».

**2. Место нахождения Банка, телефон, факс, электронный адрес (e-mail)**

Местонахождение Банка: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3.

Телефон: (017) 229 63 25, факс (017) 229 64 43.

Электронный адрес E-mail: info@belapb.by

УНП 100693551, ОКПО 00040577.

**3. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться годовая финансовая отчетность Банка, информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации Банка либо о возбуждении в отношении Банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве), о внесенных изменениях в проспект эмиссии облигаций, и сроки их публикации**

Годовая финансовая отчетность Банка ежегодно публикуется в газетах «Звязда» и «Рэспубліка» не позднее 25 апреля года, следующего за отчетным.

Годовая финансовая отчетность Банка за 2013 год опубликована 25.03.2014 в газетах «Звязда» (№ 54), «Рэспубліка» (№ 54).

В газете «Звязда» публикуется следующая информация:

- в случае принятия решения о реорганизации или ликвидации Банка – не позднее 2-х месяцев с момента принятия такого решения;

- в случае возбуждения в отношении Банка производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) – в течение 5 дней с момента получения соответствующего судебного постановления;

- в случае внесения изменений в проспект эмиссии облигаций – не позднее 7 дней после регистрации указанных изменений Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.

**4. Размер уставного фонда Банка**

Уставный фонд Банка составляет 6 803 635 046 000 (Шесть триллионов восемьсот три миллиарда шестьсот тридцать пять миллионов сорок шесть тысяч) белорусских рублей.

**5. Депозитарием, обслуживающим Банк**, является Депозитарий ценных бумаг Банка (адрес: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3), действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданного Министерством финансов Республики Беларусь, сроком действия до 18.07.2022, регистрационный номер 02200/5200-1246-1085.

**6. Дата, номер государственной регистрации Банка и наименование органа, его зарегистрировавшего**

Банк преобразован из Белорусского республиканского банка Агропромбанк СССР учредительной конференцией 11.02.1991 и зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 03.09.1991, регистрационный № 20. Устав Банка утвержден общим собранием акционеров 11.02.1991 (протокол № 1) (с изменениями и дополнениями, зарегистрированными постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 11.06.2014 № 396).

Банк в своей деятельности руководствуется законодательством Республики Беларусь, международными договорами Республики Беларусь, локальными нормативными правовыми актами Банка, а также Уставом Банка.

**7. Сведения о проведении открытой продажи облигаций сто девяносто четвертого, сто девяносто пятого, сто девяносто шестого выпусков**

**7.1. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение**

Решения о выпуске сто девяносто четвертого, сто девяносто пятого, сто девяносто шестого выпусков облигаций Банка для юридических лиц в соответствии с Уставом Банка приняты Наблюдательным советом Банка 05.12.2014, протокол № 35.

**7.2. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям**

Выпуск облигаций осуществляется без обеспечения по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь при условии, что общий размер обязательств по таким облигациям не превышает 80 процентов нормативного капитала Банка (подпункт 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг»).

По состоянию на 01.11.2014 нормативный капитал Банка составляет 10 137 439,8 млн. рублей.

**7.3. Цель выпуска облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций**

Выпуск облигаций осуществляется в целях привлечения денежных средств юридических лиц.

Привлеченные средства от размещения облигаций будут направлены на фондирование кредитов корпоративным клиентам вне рамок государственных программ.

**7.4. Выпуски облигаций согласованы Национальным банком Республики Беларусь** (постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 17.12.2014 № 778).

**7.5. Форма выпуска и вид облигаций, объем эмиссии, количество, номинальная стоимость облигаций**

| Номер выпуска | 194 | 195 | 196 |
|---|---|---|---|
| Валюта выпуска | Евро | | |
| Форма выпуска и вид облигаций | Бездокументарные, именные, процентные, конвертируемые | | |
| Объем эмиссии, евро | 15 000 000 (Пятнадцать миллионов) | 15 000 000 (Пятнадцать миллионов) | 20 000 000 (Двадцать миллионов) |
| Количество облигаций (шт.) | 15 000 | 15 000 | 20 000 |
| Серия, номера облигаций | ОЕ194 0000001 - 0015000 | ОЕ195 0000001 - 0015000 | ОЕ196 0000001 - 0020000 |
| Номинальная стоимость облигации, евро | 1 000 (Одна тысяча) | 1 000 (Одна тысяча) | 1 000 (Одна тысяча) |

**7.6. Период проведения открытой продажи облигаций**

Дата начала периода размещения облигаций – 24.12.2014, дата окончания периода размещения облигаций:

сто девяносто четвертого выпуска – 23.11.2016;

сто девяносто пятого выпуска – 23.11.2017;

сто девяносто шестого выпуска – 23.11.2019.

В период размещения облигаций Банк вправе принять решение об изменении даты окончания открытой продажи облигаций.

**7.7. Место и время проведения открытой продажи облигаций**

Размещение облигаций сто девяносто четвертого, сто девяносто пятого, сто девяносто шестого выпусков облигаций осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Размещение (продажа) облигаций Банка производится после согласования Национальным банком Республики Беларусь выпусков облигаций, регистрации в Департаменте по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь выпусков облигаций, опубликования заверенной Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь краткой информации об открытой продаже облигаций сто девяносто четвертого, сто девяносто пятого, сто девяносто шестого выпусков.

Размещение облигаций осуществляется на внебиржевом рынке путем открытой продажи в филиалах, центральном аппарате Банка в течение их рабочего времени.

Пошук ісціны ўскладняецца той акалічнасцю, што назва непасрэдна звязана з назвай ракі *Лапатніца*. Дапускаецца, што лапатнікамі маглі назваць людзей, якія пасяліліся на беразе рэчкі Лапатніцы. Выпадкі такога пераносу назвы вадаёма на назву жыхароў і паселішча ў гісторыі беларускай тапаніміі сустракаліся неаднаразова. Але ў такім разе ўзнікае чарговае пытанне адносна паходжання назвы рэчкі. Сістэмны аналіз матывацыі назваў водных аб'ектаў дазволіў вылучыць гіпотэзу, што рэчка *Лапатніца* магла атрымаць сваю назву ад слова *лапацець* («вельмі хутка бегчы»), якое адлюстроўвала ў мінулым характар плыні. Аднак, улічваючы раўнінную мясцовасць, па якой працякае рака, гэтая версія выклікае сумненні.

Нельга пакідаць па-за ўвагай і тое, што ў гідраніміі Беларусі значны след пакінулі балты. Таму, магчыма, разгадку рачной назвы трэба шукаць у балцкіх мовах. Сапраўды, на тэрыторыі Літвы і Латвіі сустракаецца вельмі многа рэк, азёр, дробных геаграфічных аб'ектаў з коранем *лап-*: *Лапене, Лапішэ, Лапоя, Лапаня* і інш. Даследчыкі балцкай гідраніміі (А.Ванагас, А.Тапароў) звязваюць паходжанне такога тыпу найменняў з балцкімі словамі lapas «лісце» і lape «ліса». Але прамая матывацыйная сувязь паміж гэтымі словамі і ўласнымі назвамі не прасочваецца і наўрад ці магчымая.

Нельга сур'ёзна ставіцца і да меркавання, што назва нейкім чынам звязана з *балотніцай*, або *лапатніцай*, — відам русалкі, дзяўчыны-тапельніцы, якая жыве на балоце. Тым больш што русалкі-лапатніцы ў беларускай міфалогіі не сустракаюцца — яны з'яўляюцца характэрнай адзнакай рускай міфалогіі.

Такім чынам, ваш ліст падштурхнуў навукоўцаў да новых пошукаў паходжання таямнічай назвы. Спадзяюся, што нас наперадзе чакаюць цікавыя факты. У гэтым дапаможа больш глыбокі сістэмны аналіз і архіўныя матэрыялы.

**P. S. Шаноўныя чытачы! Вас цікавіць, што азначае назва горада, вёскі ці мястэчка, у якіх вы жывяце? А можа, той мясцовасці, адкуль вы родам? Вам хочацца ведаць, адкуль пайшлі найменні пэўных урочышчаў, лясоў, азёр, што размяшчаюцца ў вашай мясцовасці? Тады дасылайце свае лісты з пытаннямі на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага 10 а, газета «Звязда» або на электронную пошту igumenski@mail.ru, з пазнакай «Ігуменскі тракт. Родныя тапонімы».**

■ Духоўнасць

# СІМВАЛЫ, НАПОЎНЕНЫЯ СЭНСАМ

**Навошта малыя кладуць у яслі да Дзіцяткі Ісуса цукеркі і для каго дарослыя пакідаюць вольнае месца за сталом у перадкалядны вечар? Па просьбе «Звязды» айцец Юрый САНЬКО, прэс-сакратар Канферэнцыі каталіцкіх епіскапаў Беларусі, даў тлумачэнне галоўным сімвалам свята Божага Нараджэння.**



Фота Надзеі БУЖАН.

## ВІФЛЕЕМСКАЯ ЗОРКА

**Існуе шэраг версій, якія трактуюць паходжанне зоркі. Паводле адной з іх, гэтую з'яву называюць яднаннем планет. А згодна з другой гіпотэзай, Віфлеемскай зоркай была камета. Менавіта таму нават на сённяшніх калядных паштоўках можна ўбачыць зорачку з прыгожым хвосцікам.**

— Раство з'яўляецца адным з найгалоўнейшых свят у хрысціянстве. Яно мае шмат прыгожых традыцый, сімвалаў. І, безумоўна, важнае месца сярод іх займае Віфлеемская зорка. Даўнішнія іўдзейскія астраномы прызналі з'яўленне на небе буйной зоркі надзвычайным знакам. Мудрацы з Усходу ўбачылі яе і вырашылі, што нарадзіўся новы цар Іўдзейскі. Яны спачатку накіраваліся ў Іерусалім, а пасля ўжо зорка прывяла іх у Віфлеем і спынілася над месцам, дзе нарадзіўся Ісус. Яны пакланіліся Хрысту і пакінулі свае дары: ладан, смірну і золата.

Зорка з'яўляецца абавязковым атрыбутам нашых калядоўшчыкаў. Яе заўжды неслі наперадзе. Гэта сімвал прыходу на зямлю вялікага святла, якім з'яўляецца Ісус. На яго мы павінны накіроўваць свой позірк, за ім мы мусім крочыць наперад.

## ВІГІЛІЯ

**Так каталікі называюць вечар напярэдадні свята Божага Нараджэння. З вігіліяй у беларусаў звязаны шэраг павер'яў. Напрыклад, ніхто не хацеў, каб за стол садзіліся 13 чалавек. Справа ў тым, што трынаццатым па ліку апосталам называлі Іуду, які здрадзіў Ісусу. Апынуцца на яго месцы ніхто не жадаў.**

— Божае Нараджэнне — свята сямейнае, а таму асноўныя падзеі павінны адбывацца ў сям'і. Вігілія распачынаецца ўвечары 24 снежня. Вячэру пачынаюць пасля таго, як на небе з'явіцца першая зорка. Стол накрываюць белым абрусам. Пад абрус ці на яго кладуць сена, сімвал стайні, дзе нарадзіўся Хрыстос. Стравы павінны быць поснымі. Па традыцыі, у Беларусі ў гэты вечар гатуюць куццю, грыбны суп, юшку і іншыя рыбныя стравы, вараць кісель. Колькасць страў насамрэч залежыць ад дастатку сям'і. Мы заўжды імкнуліся прыгатаваць 12 страў па колькасці апосталаў. За сталом абавязкова пакідалі свабоднае месца для нечаканага госця, таго, хто можа завітаць у дом знянацку. Гэта рабілася дзеля таго, каб не паўтарыць грэх тых, хто не пусціў пераначаваць перад нараджэннем Хрыста Марыю і Іосіфа. Вернікі лічаць, што ў асобе такога чалавека да нас прыходзіць сам Ісус. Пасля вячэры сям'я накіроўваецца ў храм. А ўжо на наступны дзень мы ідзём віншаваць нашых блізкіх, адведваем хрэснікаў, перадаём паштоўкі і СМС-паведамленні.

## КАЛЯДАВАННЕ

**Цікава, што калісьці Касцёл крытыкаваў звычай калядаваць напярэдадні Раства. У чэшскіх і польскіх касцельных павучаннях XV—XVI стагоддзяў асуджалі людзей, якія ходзяць натоўпамі, крычаць і імітуюць галасы звяроў. У знак пратэсту да традыцыі калядаваць пачалі хадзіць... ксяндзы і вернікі, якія выконвалі царкоўныя песнапенні на лацінскай мове.**

— Падобная традыцыя можа не настолькі відавочная ў буйных гарадах, але ў мястэчках, вёсках яна захавалася выдатна. Памятаю, як падлеткам разам з сябрамі пераапраналіся ў пілігрымаў (нехта апранаў касцюм мядзведзя ці авечкі), хадзілі па родным Нясвіжы і калядавалі ў вігілійны вечар. Спявалі песні, віншавалі людзей са святам і за гэта атрымлівалі ад іх пачастунак.

## АПЛАТКА

**У перакладзе з лацінскай мовы — «ахвярны дар». Гэта танюсенькая хлебная плітка, якая выпякаецца з белай мукі і вады без дабаўлення дражджэй. Традыцыя выпякаць аплаткі ў межах сучаснай Беларусі з'явілася ў XV стагоддзі. Першапачаткова права выпякаць і распаўсюджваць іх належала толькі кляштарам.**

— Перад вігілійнай вячэрай усе дзеляцца аплаткай, белым хлебам, сімвалам Хрыста. І адламваем іх не дзеля традыцыі, а каб скласці пажаданні блізкім, папрасіць прабачэння, павіншаваць з надыходзячым святам. Часам для прыгажосці на аплатках малююць сцэну Божага Нараджэння ці святых. У Беларусі сёння аплаткі вырабляюць сёстры-назарэцянкі ў Навагрудку. У іх працуе сапраўдны маленькі «заводзік» па выпяканні белага хлеба.

## НАБАЖЭНСТВА

**Урачыстую імшу ў ноч на Раство ў Касцёле называюць Пастэркай. Слова паходзіць ад лацінскага pastor (пастух). Вы можаце запытаць: прычым тут пастушкі? А пры тым, што першымі, каму анёлы паведамілі пра нараджэнне Хрыста, былі пастушкі, якія непадалёк пасвілі жывёлу. Менавіта яны першымі пакланіліся народжанаму Ісусу.**

— У Нясвіжы Божае Нараджэнне святкавалі па-рознаму. Быў час, калі імша пачыналася ў 12 гадзін ночы. І гэта было даволі цікава. Усе спачатку праводзілі час дома з сям'ёй, а пасля прыходзілі ў храм, каб правесці гэтую ноч у касцёле. Усе разам чакалі світання. Веруючыя прыязджалі да нас з усяго раёна! Нягледзячы на тое, што ў касцёле было даволі холадна (нясвіжскія зімы калісьці былі далёка не еўрапейскімі), для многіх гэта з'яўлялася сапраўднай падзеяй. Для дзяцей пайсці ў касцёл і вярнуцца дадому а 4-й гадзіне было даволі адважным учынкам.

## КАЛЯДНАЯ ЁЛКА

**Гэта пры Саветах пачалі ўпрыгожваць навагоднюю ёлку, а раней яна заўжды была калядная. Традыцыя завіхацца з хвойным дрэвам узнікла ў сярэднявечнай Германіі. Праз некалькі стагоддзяў яна «трапіла» ў Англію і Францыю, а потым распаўсюдзілася па ўсёй Еўропе. Упрыгожвалі ёлку раней не пластыкавымі шарамі, а пернікамі ў форме сэрца, арэхамі, вырабамі з каляровай паперы, саломы... Да нас падобная традыцыя прыйшла толькі ў XIX стагоддзі.**

— Ёлка — вечназялёнае дрэва, якое сімвалізуе надзею на вечнае жыццё. Яно таксама павінна стаяць падчас свята ў нашых сем'ях. Прыгожа прыбраная ёлка падкрэслівае важнасць свята для дзетак, якія ў Раство шукаюць пад дрэвам падарункі ад святога Мікалая.

## ЯСЕЛЬКІ

**З'яўляюцца часткай каляднай кампазіцыі, макета, які паказвае інтэр'ер стайні ў Віфлееме ў тую ноч, калі там нарадзіўся Ісус Хрыстос. Часцей за усё яна прадстаўлена ў форме стаенкі. У кожнай батлейцы знаходзіцца Ісус, Дзева Марыя, святы Іосіф. Даволі часта ўдзельнікамі падобных экспазіцый становяцца мудрацы, якія прынеслі дары Ісусу, авечка, вол і асёл. Першую падобную пастаноўку змайстраваў святы Францішак яшчэ ў 1223 годзе. Адбылося гэта ў Італіі.**

— Традыцыі ўзмацняюць чалавека. Мы святкуем Божае Нараджэнне не з адчуваннем, што гэта надышла гістарычная дата, пазначаная ў нашым календары. Мы святкуем яго з думкай аб тым, што Ісус нараджаецца сёння сярод нас, у нашым асяроддзі, у нашых сем'ях і сэрцах. Кіруючыся ёй, я вырашыў: яслі, сцэна нараджэння Ісуса Хрыста ў маёй парафіі на Залатой Горцы будуць выглядаць нетрадыцыйна. Мы збудавалі вялікі макет сучаснага горада, па якім ездзяць цягнікі, машыны, стаіць ёлка, а ў цэнтры, на ўзвышшы, знаходзіцца сцэна Божага Нараджэння.

Каля яселек у гэтыя святочныя дні можна часта пабачыць маленькіх дзетак. Яны прыходзяць да Ісуса, нібы маленькія мудрацы, каб пакінуць свае дары, — цукеркі і мандарынкі для пачастунку. Для дзіцяці кожнае свята як вялікая ўрачыстасць. Аднойчы ў адным касцёле ў перыяд святкавання Божага Нараджэння знікла фігура маленькага Ісуса. «Ведаеце, што адбылося? У нас знікла фігура Дзіцяткі Ісуса», — разгублена казаў тады святар. Тым часам з-за спінак самых далёкіх касцельных лаў пачулася нейкая мітусня, і праз некалькі секунд у цэнтральным праходзе з'явіўся хлопчык, які цягнуў на матузку вялікі самазвал. «Гэта я ўзяў маленькага Ісуса, — шчыра прызнаўся хлопчык. — Бо паабяцаў яму, што, калі мне бацькі падораць вялікую машынку, ён будзе першым, каго я пакатаю».

**Тарас ШЧЫРЫ.**



Фота Тараса ШЧЫРАГА.

■ Захапленні

# «ДАСПЕХІ СТАГОДДЗЯ»

### Як у Сярэднявеччы жылі людзі еўрапейскай зямлі?..

**Клубы гістарычнай рэканструкцыі — гэта асаблівы свет, у якім ажываюць цэлыя эпохі. Крыжакі ці ваяры-ліцвіны, шатландскія або англійскія пехацінцы — кім быць, можна выбраць на ўласны густ. А далей, паслядоўна, дзень за днём шыць сабе адпаведны касцюм, падбіраць зброю, вывучаць культуру... Для сучаснага глабалістычнага свету такое захапленне, пагадзіцеся, здаецца вельмі элітарным.**



Ваяр з «Кароны Захаду».

Фота Вольгі МЕНДЗЯЛЕЕВАЙ.

Убачыць касцюмы розных эпох, зброю, зробленую па ўзорах арыгінальнай, старажытныя музычныя інструменты можна было на выставе-конкурсе «Даспехі стагоддзя», якая ладзілася ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце. Прэзентаваць свае працы сюды завіталі кіраўнік народнага ваенна-гістарычнага клуба «Золак» горада Жодзіна, кіраўнікі клуба гістарычнай рэканструкцыі «Люцэрн» Мінскага палаца дзяцей і моладзі Ірына Салавей і Андрэй Фралоў, а таксама ўдзельнікі клубаў «Карона Захаду» Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнай і тэхнічнай творчасці. Кожны клуб прадставіў свой герб (і яго сімволіку), даспехі, баявое ўзбраенне, прадметы побыту, гістарычныя касцюмы.

Напачатку было не зразумела, чаму ў тэхнічным універсітэце ладзіцца такая выстава. Аднак **начальнік аддзела беларускай народнай творчасці цэнтра «Берагіня» гэтай установы Ала АЎСЯННІКАВА** патлумачыла, што такі конкурс у іх арганізаваны для таго, каб зацікавіць студэнтаў таксама займацца рыцарствам, каб акунуцца ў гэты іншы свет і захапіцца ім. Такое захапленне — добрая альтэрнатыва спайсам, ужыванню алкаголю, іншым дрэнным звычкам, мяркуе спецыяліст. Калі моладзь будзе бавіць свой час, ствараючы сярэднявечныя касцюмы, рэканструюючы мінулыя эпохі, у яе папросту не будзе часу на розныя глупствы.



Рыцар з клуба «Люцэрн».

Напачатку студэнты на тое, што бачылі, рэагавалі па-рознаму. Там, дзе адзін смяяўся, іншы ўпэўнена і шчыра казаў: «А я хачу гэтым займацца». Калі ж майстры, што завіталі да студэнтаў, правялі майстар-клас па вырабе старажытнага адзення, ніхто з моладзі не застаўся абыякавым.

Спецыяльным госцем дзеі быў **старшыня Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Яўген САХУТА.** Ён так пракаментаваў убачанае:

— Апошнім часам мы можам назіраць, як расце цікавасць грамадства да забытых старонак нашай мінуўшчыны. Адраджаюцца розныя тэхналогіі, асабліва па апрацоўцы металу; людзі звяртаюць сваю ўвагу на ўзбраенне мінулых стагоддзяў. Папулярным робіцца ўзнаўленне старажытнага касцюма. Музычныя інструменты нашых продкаў таксама звяртаюць на сябе ўвагу. Такім чынам, сучаснікі вывучаюць, як жылі продкі, як баранілі сваю зямлю, як дапамагалі суседзям, а часам і змагаліся з імі. Прыемна, што гэтыя традыцыі сёння жывыя. Душа радуецца, калі глядзіш на тыя рэчы, што адноўлены па аўтэнтычных тэхналогіях. Можна ўбачыць амаль усе спосабы апрацоўкі металу: чаканка, ліццё, халоднае і гарачае каванне, гравіраванне. Даволі поўна прадстаўлены і іншыя віды рамёстваў. Важна, што ў працэсе такой дзейнасці, хочам мы таго або не, пранікаемся адной важнай думкай: у Сярэднявеччы нашы тэрыторыі былі еўрапейскай дзяржавай. Любое дасягненне — тэхналагічнае, культурнае, ваеннае, ці якое іншае, заходнееўрапейскае — адразу рабілася вядомым нашым майстрам, асабліва ў гарадскіх цэхах, якія тут жа іх перахоплівалі і дапрацоўвалі на свой лад. Гэтыя традыцыі, якія працягваюцца і адраджаюцца сёння, падкрэсліваюць нашу еўрапейскасць.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ

# Лазанкі

**Гэтая страва (а дакладна — кампанент больш складаных страў) вядомая беларускім этнографам досыць даўно і трапіла ў многія энцыклапедыі. Яна шырока вядомая ў Браслаўскім, Мядзельскім, Ваўкавыскім раёнах, часткова на Магілёўшчыне, Цэнтральным і Усходнім Палессі. Зрэшты, гэта толькі некаторыя месцы, дзе лазанкі зафіксавалі этнаграфічныя экспедыцыі, з чаго зусім не вынікае, што іх не ведалі ў іншых раёнах Беларусі. Проста не ўсюды этнографы даехалі.**

Рабіць лазанкі досыць проста: крута замешанае цеста з пшанічнай, жытняй або грэцкай мукі тонка раскачваюць, рэжуць на квадраты (ромбы, трохкутнікі), вараць, адцэджваюць, заліваюць салам, алеем з цыбуляй ці смятанай, у пост — цёртым макам, тоўчаным ільняным семенем, размятымі ягадамі. У больш дасканалых варыянтах адвараныя лазанкі тушаць у пячным духу са смятанай або запякаюць з мясам, капустай і іншымі дадаткамі; часам смажаць. У іншых выпадках лазанкі ўжываюцца як састаўная частка супоў — напрыклад, грыбнога або юшкі.

І тэхналогія прыгатавання, і сама назва выклікаюць асацыяцыі з італьянскай лазанняй. Такое супадзенне, натуральна, невыпадковае. Лазанкі, вядомыя таксама ў Польшчы, Літве і ва Украіне, і ёсць не што іншае, як адаптаваная некалі кухняй Рэчы Паспалітай лазання. Гэтая страва мае вельмі доўгую і цікавую гісторыю. Лазанья (lasagne), як мяркуюць, — найбольш старажытная форма «пасты». Ёсць звесткі, што напачатку ў Старажытнай Грэцыі словам laganon называлі пляскатую хлебную ляпёшку. Рымляне, пазычыўшы такую ляпёшку ад грэкаў, пачалі разразаць яе на тонкія скрылі, якія называлі lagani. Іх любілі Цыцэрон і Гарацый. Лічыцца, што lagani ўяўлялі сабой смажаныя палоскі цеста, якія дадаваліся ў тушаную агародніну або ў супы. У ранняе сярэднявечча страва трансфармавалася і стала падобнай да мучных клёцак, якія дадаваліся ў гаршчок з тушанымі мясам або агароднінай. У часы Марка Пола (XIII стагоддзе) лазання ўжо, у асноўным, была падобнай на сучасную: тонкія пляскатыя шырокія кавалкі цеста, звычайна прамавугольныя — а пры сучаснай масавай вытворчасці пераважна гафрыраваныя (накшталт шыферу). Спачатку яны адварваюцца як локшына (хуткага прыгатавання), а потым тушацца ў печы ці духоўцы з разнастайнымі дадаткамі (агароднінай, мясам, грыбамі і г.д.).

Калі і як лазанкі трапілі з Італіі да нас? Прынята лічыць, што гэтай кулінарнай інавацыяй, як і многімі іншымі (напрыклад, зялёнай салатай і ўвогуле разнастайнай зелянінай) мы абавязаны каралеве Боне Сфорцы, жонцы караля Жыгімонта Старога і маці Жыгімонта Аўгуста. З самага прыезду ў Польшчу і Літву ў 1518 годзе Бона мела шматлікае акружэнне з італьянцаў, адмыслоўцаў у розных галінах, у тым ліку кухараў, якія зрабілі значны ўплыў на пашырэнне найноўшых заходнееўрапейскіх культурных і тэхнічных дасягненняў, спажывецкіх прыхільнасцяў эпохі Рэнесансу на нашых землях. З яе іменем звязваюць з'яўленне або пашырэнне ў меню арыстакратыі экзатычнай усходняй садавіны — апельсінаў, лімонаў, гранатаў, а таксама прыпраў — шафрану, фенхелю, імбіру, цынамону, цукру; яшчэ і алівак, каштанаў, разынак, міндалаў, марцыпанаў, рысу і г.д. Найбольш яскравым новаўвядзеннем эпохі Боны лічыцца салата і іншая гародніна, а таксама ўвядзенне ва ўжытак відэльцаў.



Нават калі лазанкі і не былі запазычаны менавіта пры Боне, у любым выпадку сувязі з італьянскай кухняй, усталяваныя пры ёй, дакладна прычыніліся да таго, што адзін з самых прыкметных элементаў гэтай кухні рана ці позна трапіў у меню нашых продкаў. Пры гэтым лазанкі набылі «тутэйшы» акцэнт: іх сталі гатаваць з тыпова мясцовымі дадаткамі.

Адна з першых згадак пра лазанкі ў Рэчы Паспалітай адносіцца да 1632 года. Французскі інжынер-фартыфікатар Гіём Баплан прыгатаваў тады лазанкі з грэцкай мукі з макавым малаком. Гэта тыпова вігілійная страва, якую гатуюць напярэдадні Божага Нараджэння. Менавіта да гэтага свята пераважна і гатавалі ў нас лазанкі: напрыклад, лазанкі з капустай і грыбамі або грыбны суп з лазанкамі. Часам лазанкамі, якія вараць або тушаць, называлі таксама падобныя да іх формай ламанцы — сухое каляднае печыва, якое ядуць, макаючы ў мядовую сыту або макавае малако.

Шырокае засваенне лазанак народнай кулінарыяй Беларусі адбылося ў XIX стагоддзі. Галоўная тагачасная кулінарная кніга — «Кухарка Літоўская» Вінцэнты Завадскай — згадвае толькі 2 віды лазанак: лазанкі, запечаныя з вясковым сырам (відавочна, тварожным клінковым) і дэсертныя лазанкі, запечаныя з маслам, цукрам, разынкамі і яйкамі. Але насамрэч вядома пара дзясяткаў чыста тутэйшых варыянтаў лазанак — пераважна посных, але таксама і з мяснымі дадаткамі.

Выключна беларускае слова, якім можна называць лазанкі, — «скрылікі», або «скрылькі». Як ні дзіўна, яно лепш захавалася ў літоўскай мове, дзе лазанкі называюць па-рознаму, але часцей за ўсё skrydlai, skrylai. Гэта не выключэнне, а, хутчэй, правіла: беларускія стравы часта называюць словамі, запазычанымі з літоўскай, і наадварот.

Шмат у якіх рэстаранах Беларусі сёння можна пакаштаваць без асаблівых праблем італьянскую лазанню — але паспрабуйце запытацца там пра тутэйшыя лазанкі! Зрэшты, чаму б менавіта італьянскім рэстаранам не распачаць адраджэнне незаслужана забытай нашым гастранамічным афіцыёзам стравы? У якасці майго невялічкага ўнёску ў гэтую справу, актуальныя рэцэпты:

### ЛАЗАНКІ
**(базавы рэцэпт)**



**Складнікі:** *2 шклянкі мукі, 2 яйкі, 3-4 лыжкі вады, соль.*

**Спосаб прыгатавання.** Муку прасеяць на раскатачную дошку, зрабіць паглыбленне, убіць яйкі, уліць ваду, перамяшаць да атрымання загусцелай, цвердаватай масы, старанна сфармаваць, падзяліць на часткі, тонка раскачаць і пакінуць цеста, каб падсохла. Затым пасыпаць мукой, скруціць у рольку (жгут), якую пакроіць на палоскі шырынёй 2 см, а іх падзяліць на квадрацікі і раскачаць па дошцы. Лазанкі апусціць у кіпячую падсоленую ваду, перамяшаць, прыкрыць накрыўкай, пaварыць, адцадзіць, зліць гарачую ваду.

### ТЫПОВА «ВІГІЛІЙНЫЯ» ЛАЗАНКІ З КІСЛАЙ КАПУСТАЙ І ГРЫБАМІ

**Складнікі:** *мука і яйкі на лазанкі як у папярэднім рэцэпце (або 500 г гатовых лазанак — напрыклад, італьянскіх), 500 г кіслай капусты, 1 цыбуля, 50 г сушаных баравікоў, 2 ст. лыжкі мукі, 2 ст. лыжкі масла + трохі масла або алею для змазвання формы, алей або аліва (з алівак), соль, перац на смак.*

**Спосаб прыгатавання.** Грыбы старанна мыем, замочваем на ноч у халоднай вадзе, затым варым да гатоўнасці, адцэджваем і дробна крышым (адвар не выліваем). Капусту, калі занадта кіслая, палошчам, затым заліваем грыбным адварам, трохі разбаўляем вадой і варым да мяккасці. Гатуем лазанкі як у папярэднім рэцэпце (або варым фабрычныя паводле рэцэпту на ўпакоўцы, да стану al dente — трохі недаваранага). Цыбулю дробна крышым, падсмажваем на патэльні да празрыстага стану, дасыпаем муку і дасмажваем. Змешваем капусту з грыбамі і засмажкай, дадаём 1—2 лыжкі алею і яшчэ хвіліну дасмажваем на малым агні. Дадаём соль і перац на смак. Выкладваем на бляху і запякаем у духоўцы пры тэмпературы 200°С каля 20 хвілін.

■ Кантрамарка

# ТУТ ЁСЦЬ І ВАША ГІСТОРЫЯ

**Каб зразумець чалавека, трэба прайсці шлях у яго чаравіках. Літаральнае тлумачэнне гэтай прымаўкі рэжысёр Аляксандр Марчанка пераўтварыў у сцэнічнае вырашэнне спектакля «Мабыць?». Для таго, каб зразумець, хто такія сучасныя беларусы, у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі ў прамым сэнсе пераабулі акцёраў і гледачоў.**



Фота Аляксандра МАРЧАНКІ.

## ВАЗЬМІЦЕ ТАПАЧКІ!

Падчас спектакля акцёры выходзяць у залу і пачынаюць прапаноўваць гледачам пераабуцца ў тапачкі. Рашаюцца адзінкі. Мала хто з нас гатовы выйсці з зоны глядацкага камфорту і пагадзіцца на ўдзел у спектаклі. Тым больш акцёры, змяніўшы абутак, распавядалі жыццёвыя гісторыі. А раптам таксама прыйдзецца? Да таго ж некаторыя ўжо пачулі сябе са сцэны — некалькі разоў на працягу спектакля выканаўцы зачытваюць пісьмовыя адказы гледачоў на пытанні пра талерантнасць, веру і трываласць, зададзеныя перад спектаклем на каляровых паперках (наўрад ці хто падазраваў, што вынікі гэтага апытання будуць агучаны так хутка). Спектакль «Мабыць?» адмаўляе тэатр забаўляльны, дзе глядач адчувае сябе досыць бяспечна. Дый сцвярджае тэатр сацыяльны, надзённы, дзе ад гледача патрабуюць саўдзельніцтва ды суразважання. Тапачкі — гэта адзін са спосабаў ініцыяцыі...

Рэжысёр Аляксандр Марчанка, драматург Дзмітрый Багаслаўскі і 12 акцёраў РТБД звярнулі ўвагу на людзей, што жывуць побач, узялі ў іх інтэрв'ю і стварылі з гэтых інтэрв'ю спектакль «Мабыць?» пра сучасных беларусаў. На сцэну «выйшлі» футбольны фанат і дзяўчына, якая ратуе бяздомных жывёл. Жанчына, якая захапляецца спірытызмам, і журналіст, які патрапіў у няёмкае становішча з жабракамі каля царквы. Кантралёр грамадскага транспарту і дзед Ягор з пчальніка. Італьянец, які любіць Беларусь, але смяецца з беларускай мацарэлы, і ахвяры хатняга гвалту. У іх гісторыях не змянілі ні слова, толькі зманціравалі адпаведным чынам, стварыўшы дакументальны спектакль пра тых, хто жыве тут і цяпер.

## ГАЛАСЫ ВАКОЛ ПЫТАННЯЎ

Для шматлікіх удзельнікаў беларускай тэатральнай супольнасці існуе толькі тое мастацтва, якое існуе на рэпертуарнай сцэне. Астатняе — не сур'ёзна. Прэм'ера «Мабыць?» можа быць расцэнена як пэўная «легалізацыя» новай формы на рэпертуарнай сцэне. Аднак заўважу, што дакументальны тэатр з'явіўся на Беларусі ў пачатку XX стагоддзя: слынныя тэатры рэвалюцыйнай сатыры, «жывыя газеты» і агітацыйная «Сіняя блуза», якія працавалі з парадкам дня. З тае пары дакументальны жанр развіваўся і кропкава прысутнічаў у тэатральным працэсе. Фармальна «Мабыць?» трывала звязаны тэатральнымі інсцэніроўкамі кніг Алеся Адамовіча, Святланы Алексіевіч ды іншых дакументалістаў. Іх аб'ядноўвае маналагічная структура драматургічнага матэрыялу. Жанр спектакля «Мабыць?» вызначаны як «галасы вакол нашых пытанняў».

Спектакль Аляксандра Марчанкі дэкларуе шматлікія прынцыпы новага дакументальнага тэатра. Для стварэння тэксту выкарыстана тэхніка verbatim, якая патрабуе нечаканых фармулёвак падчас размовы і даслоўнай перадачы акцёрамі мовы героя. Сцэнаграфія (мастак Юрый Саламонаў) вырашана вельмі сціплымі сродкамі: двухузроўневы заднік ды шмат абутку, які то валіцца з-пад штанкетаў, то вылятае з-за куліс. Акцёры ж выходзяць на сцэну ў аднолькавых чэшках, і абуванне ў кеды, модныя боты ці ваўняныя шкарпэткі азначае пераўвасабленне ў героя, ад імя якога зараз прагучыць маналог. Рэжысёр адмаўляецца ад традыцыйнага музычнага афармлення — на сцэне толькі жывая музыка, якую кампазітар Ягор Забелаў выконвае на баяне і спалучае з рытмам дзеяння. Акцёры працуюць без грыму і касцюмаў (у сэнсе: з'яўляючыся на сцэне ў паўсядзённым адзенні, тым самым падкрэсліваючы сваю сучаснасць і блізкасць гледачу). Хаця ад некаторых «запаветаў» рэжысёр свядома адмаўляецца. Напрыклад, харэаграфія і пластыка ў пастаноўцы не неабходнасць, а сродак выразнасці, што, у прынцыпе, не прадугледжана ідэяй дакументальнага тэатра. Аднак гэты факт не абвяргае дакументальнасці, а падкрэслівае, што радыкальнае адмаўленне сродкаў тэатральнай выразнасці, абнуленне, якое стала важным для гэтага жанру на пачатковым этапе, паступова страчвае сваю актуальнасць, ствараючы новую тэатральную мову.

## НАД ПРОРВАЙ У ТЭКСТАХ

Адметнасць «Мабыць?» не толькі ў засваенні новай тэатральнай мовы, але і ў тым, што на рэпертуарнай сцэне пакрыху з'яўляецца сацыяльны тэатр, які даследуе праблемы сучаснасці. З'яўленню канкрэтна гэтай пастаноўкі папярэднічала шмат падзей: майстар-класы вядомых расійскіх драматургаў-дакументалістаў Міхаіла Дурнянкова і Любові Мульменкі ў Цэнтры беларускай драматургіі, дакументальны праект Андрэя Саўчанкі «Бі-Лінгвы», спектакль «PATRIS» Сяргея Анцэлевіча, Дзмітрыя Багаслаўскага і Віктара Красоўскага (Цэнтр візуальных і выканаўчых мастацтваў). І гэты пералік робіць відавочным разлом паміж праектным і рэпертуарным тэатрам Беларусі...

Месца сучаснай беларускай п'есы ў рэпертуарным тэатры выразна акрэсліла III Нацыянальная тэатральная прэмія: з 11 намінаваных драматычных спектакляў толькі адзін — «Падобны да Стынга» Ірыны Пісьменнай — створаны па п'есе сучаснага беларускага драматурга (інсцэніроўкі фактычна статыстыку не паправяць, бо зазвычай гэта інсцэніроўкі класікі). Пры тым, што ў краіне штогод прэзентуецца шэраг цікавых тэкстаў, на рэпертуарную сцэну, на жаль, трапляюць адзінкі. І вось сярод гэтых адзінак удалося адваяваць сабе месца дакументальнаму, даследчаму тэатру, які яшчэ адным швом, але знітоўвае парваную рэчаіснасць беларускага тэатральнага працэсу. І, безумоўна, фіксуе адлюстраванне канкрэтнага моманту і на яго падставе спрабуе асэнсаваць сучаснасць. Распавядае пра нас, якія мы ёсць сёння, і дапамагае нешта пра сябе зразумець. Тут ёсць і ваша гісторыя.

**Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ**

# Зіма — фестывалі, конкурсы, выстаўкі



**Па гарызанталі: 3.** «... 2015». Міжнародныя спаборніцтвы па зімніх відах ездавога спорту, якія пройдуць у спартыўным комплексе «Раўбічы» з 13 па 15 студзеня. **8.** У старажытнаегіпецкай міфалогіі — бог сонца, тое, што і Ра. **9.** Выстаўка-ярмарка вырабаў ручной працы, якая адбудзецца ў перыяд з 19 па 21 снежня ў г.Мінску. **10**. Гімнастычны ... . Прыстасаванне для гімнастычных практыкаванняў. **11**. «На ... да Зюзі Паазерскага». Навагодняе тэатралізаванае прадстаўленне, якое штогод, у снежні і студзені, адбываецца на Пастаўшчыне, на сядзібе Зюзі Паазерскага. **13**. «Станькаўскага лесу ... ». Цікавае навагодняе свята з карагодамі, гульнямі каля ёлкі, якое адбудзецца з 20 снежня па 4 студзеня ў цэнтры экатурызму «Станькава», што на Дзяржыншчыне. **14**. Буйны горад, дзе ў студзені адбудзецца міжнародны фестываль класічнай музыкі «Студзеньскія музычныя вечары», а з 3 па 6 студзеня — фестываль-конкурс дзіцячай і юнацкай творчасці «У гасцях у Дзеда Мароза». **16**. «Са Снягуркай ... Мароз школы ўсе аб'ехалі,\\Раздарылі цэлы воз\\Забавак з пацехамі». З верша В.Зуёнка «З новымі пяцёркамі». **17**. ... - эйр. Спаборніцтва, на якім лыжнік пасля скачка з трампліна выконвае ў палёце розныя трукі. **18**. «Мароз як пацалуе ў шчокі,\\Ажно ўсяго кідае ў ...». З верша П.Броўкі «Зімовае». **19**. Шорт — ... . Хуткасны бег на каньках на кароткай дарожцы. **22**. Горы ў Заходняй Еўропе, дзе знаходзіцца шмат лыжных курортаў. **23**. Скачок у фігурным катанні. **25**. Устройствы для газіравання пітной вады. **27**. «Славянскія ...». Трэці міжнародны фестываль, праграма якога ўключае танцавальную творчасць, цыркавое мастацтва і іншае, пройдзе ў г.Мінску з 9 па 12 студзеня. **29**. У снежні адкрытае ... — летам горача і суха (прык.). **30**. Лёгкая платформа з парусам на палазках для катання на лёдзе. **31**. Месца, куды заганяюць шайбу або мяч.

**Па вертыкалі: 1.** «Там празрысты звонкі лёд,\\Там вясёлы ...». З верша Д.Бічэль-Загнетавай «Мае канькі». **2.** Спартыўныя сані. **4.** Карона, якую трымаюць над галовамі маладых у час вянчання (уст.). **5.** Раённы цэнтр на Віцебшчыне. **6.** Светлае англійскае піва. **7.** Збор звестак шляхам атрымання адказаў на пэўныя пытанні. **12**. «І цягне бегчы на прастор — \\Туды, дзе ... гаспадарыць». З верша Т.Дзям'янавай «Зіма. Завеі. Халады». **15**. Цытата, што змяшчаецца перад творам. **20**. Спаборніцтва, мэтай якога з'яўляецца вылучэнне лепшых яго ўдзельнікаў. **21**. «Калядныя ...». Калядная святочная ярмарка, якая будзе дзейнічаць 7 студзеня ля Мінскага Палаца спорту. **23**. Навостраны бок ляза. **24**. Металічны прут. **26**. Гатунак моцнай і тоўстай апрацаванай скуры. **28**. Вузкі бок якога-небудзь прадмета.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі: 3**. Завіруха. **8**. Амос. **9**. «Млын». **10**. Снарад. **11**. Госці. **13**. Цуды. **14**. Брэст. **16**. Дзед. **17**. Біг. **18**. Жар. **19**. Трэк. **22**. Альпы. **23**. Фліп. **25**. Сіфон. **27**. Сустрэчы. **29**. Вуха. **30**. Буер. **31**. Вароты. **Па вертыкалі: 1**. Карагод. **2**. Боб. **4**. Вянец. **5**. Ушачы. **6**. Эль. **7**. Анкета. **12**. Снежань. **15**. Эпіграф. **20**. Конкурс. **21**. Забавы. **23**. Фаска. **24**. Прэнт. **26**. Юхт. **28**. Руб.

Даты | Падзеі | Людзі — **23 СНЕЖНЯ**

**1769** год — нарадзіўся (г. Ігумен) Міхал Рымінскі, танцоўшчык, спявак, драматычны акцёр. Вучыўся ў балетнай школе А.Тызенгаўза ў Паставах (пазней выкладаў у ёй). У 1785—1794 гадах — першы танцоўшчык трупы «Таварыства танцоўшчыкаў яго каралеўскай вялікасці» ў Варшаве, выступаў на каралеўскіх сцэнах як драматычны акцёр і спявак і ў Нацыянальным тэатры. Падчас царавання Станіслава Аўгуста Панятоўскага быў найбольш папулярным балетным артыстам Рэчы Паспалітай. Сярод партый: Гілас («Гілас і Сільвія»), Адоніс («Венера і Адоніс»), Марк Антоній («Клеапатра і Марк Антоній») і іншыя. Памёр у 1797 годзе.

**1799** год — нарадзіўся Карл Брулоў, славуты рускі мастак, партрэтыст, працаваў і ў гістарычным жанры. У сваіх карцінах «Італьянская раніца» і «Італьянскі поўдзень» ён паспяхова вырашыў праблему асвятлення, паказаў узаемасувязь чалавека з прыродай. Пасля копіі з фрэскі Рафаэля «Афінская школа» Брулоў пачаў працу над вялікай карцінай — «Апошні дзень Пампеі». Яе задума была звязана з модай на археалогію, а таксама з актуальнасцю: у 1828-м адбылося невялікае вывяржэнне Везувія. Карціна выклікала ў Пецярбургу захапленне. Карл Брулоў асабіста падарыў яе імператару Мікалаю I. Некалькі твораў мастака сёння захоўваюцца і ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі

**1891** год — нарадзіўся (вёска Пунішча, цяпер Віцебскі раён) Мінай Піліпавіч Шмыроў (партызанскі псеўданім — бацька Мінай), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Віцебшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Герой Савецкага Саюза (1944). Падчас грамадзянскай вайны ўдзельнічаў у баях супраць войск Краснова, Карнілава, Юдзеніча. З 1921 года — камандзір атрада па барацьбе з бандытызмам на Віцебшчыне. У ліпені 1941 года ў Суражскім раёне арганізаваў і ўзначаліў партызанскі атрад, які ўвайшоў у склад 1-й Беларускай партызанскай брыгады. Партызанская брыгада бацькі Міная стварыла на ўчастку Усвяты —Тарасенкі так званыя «Суражскія вароты», якія ўвайшлі ў гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Гэта 40-кіламетровы ўчастак уздоўж берага Заходняй Дзвіны, праз які можна было свабодна пераходзіць з акупаванай нямецка-фашысцкімі войскамі Беларусі на вызваленую Чырвонай Арміяй тэрыторыю. Праз «Суражскія вароты» на Вялікую зямлю праходзілі мірныя жыхары, навабранцы, пераганялі жывёлу, вывозілася збожжа. Тут жа партызаны атрымлівалі зброю, праходзілі вайсковыя дыверсійна-разведвальныя групы. Мужны партызанскі камбрыг перажыў страшную чалавечую трагедыю: былі ўзяты ў заложнікі яго чацвёра непаўналетніх дзяцей — дочкі Ліза, Зіна, сыны Сярожа, Міша, а таксама сястра і маці жонкі. Яны былі расстраляны фашыстамі... Пасля вайны Мінай Піліпавіч знаходзіўся на гаспадарчай рабоце ў Віцебску. Памёр у 1964-м. Яго іменем названы вуліца, парк, сярэдняя школа ў Віцебскім раёне. У Віцебску ўстаноўлены бюст і створаны мемарыяльны музей.



Было сказана

**Аркадзь КУЛЯШОЎ, народны паэт Беларусі:**

*«Лепш цяжка жыць, чым жыць бадзёрым трупам — Гарэць агнём, якога ўжо няма...».*

■ Спорт-тайм

# «Маладзёжка» вяртаецца ў эліту

**У тыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» распавядае пра доўгачаканы прарыў маладзёжнай зборнай па хакеі і «бронзу» Надзеі Скардзіна, а таксама знаёміць чытачоў з 29-м галоўным трэнерам футбольнага «Дынама-Мінск».**

**1. Зборная Беларусі па хакеі** не здолела абараніць леташні тытул на міжнародным турніры Arosa challenge. Спачатку нашы хакеісты перайгралі каманду Славакіі (2:1), а ў фінальным матчы ўступілі гаспадарам спаборніцтваў — швейцарцам (2:3). Пасля другога перыяду ў беларусаў была перавага ў ліку, але замацаваць яе не атрымалася з-за вялікай колькасці выдаленняў. Апошнія дзве шайбы швейцарцы закінулі ў большасці. Адзначым, што для нашай каманды гэта быў першы старт пад кіраўніцтвам новага трэнера Дэйва Льюіса.



А вось **маладзёжная зборная выдатна выступіла на чэмпіянаце свету** сярод каманд дывізіёна I. Падапечныя Паўла Перапёхіна атрымалі пяць перамог, перайграўшы равеснікаў з Аўстрыі, Італіі, Латвіі, Нарвегіі і Славеніі. Такім чынам, налета беларуская каманда, упершыню з 2007 года, выступіць у элітным дывізіёне маладзёжнага чэмпіянату свету.

**2. Трэці этап Кубка свету па біятлоне** завяршыўся перамогай Дар'і Домрачавай у пасьюце і «бронзай» Надзеі Скардзіна ў масстарце. У спрынце лідар нашай зборнай выступіла не вельмі ўдала, фінішаваўшы на шостым месцы, а вось у гонцы праследавання, скарыстаўшыся «чыстай» стральбой, дабілася другой перамогі ў сезоне.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў біятланістку Дар'ю Домрачаву з перамогай у гонцы праследавання на 3-м этапе Кубка свету па біятлоне ў Славеніі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «Малайчына! Дзякуй! Жадаю поспехаў!» — гаворыцца ў віншавальнай тэлеграме кіраўніка дзяржавы.**

А вось мас-старт для Домрачавай не задаўся з самага пачатку. На выхадзе са штрафнога круга пасля першай стральбы Дар'я сутыкнулася з іншай біятланісткай і моцна ўпала, пашкодзіўшы вінтоўку. Але замена інвентару не дапамагла: на другім агнявым рубяжы трохразовая алімпійская чэмпіёнка дапусціла чатыры промахі і вырашыла сысці з дыстанцыі. Затое выдатна гонка склалася для Надзеі Скардзіна, якая прадэманстравала ідэальную стральбу і неблагі ход па дыстанцыі і замкнула прызавую тройку.

Няўдача ў мас-старце адкінула Дар'ю Домрачаву на трэцяе месца ў агульным заліку. Цяпер адставанне ад лідара сезона фінкі Кайсы Макарайнен складае 119 ачкоў, ад украінкі Валянціны Семярэнкі — 25 ачкоў. Надзея Скардзіна ў «тэтале» — пятнаццатая.

**3. Зборная Беларусі па фрыстайле** заняла трэцяе месца на этапе Кубка свету ў Пекіне ў новым відзе спаборніцтваў — камандных скачках. Наша каманда ў складзе Ганны Гуськовай, Дзяніса Осіпава і Максіма Гусціка фінішавала ўслед за кітайскімі і расійскімі акрабатамі. Адзначым, што ў індывідуальнай праграме і Гуськова, і Гусцік спыніліся за крок да п'едэстала, заняўшы чацвёртае і пятае месца адпаведна.

**4. Беларускія плыўцы з трыма ўзнагародамі вяртаюцца з міжнароднага турніру «Кубак Сальнікава»**, які праходзіў у Санкт-Пецярбургу. Яўген Цуркін паказаў лепшы вынік на дыстанцыі 100 метраў батэрфляем. Віктар Стасяловіч стаў другім у плаванні на спіне, а Аляксандра Герасіменя фінішавала трэцяй на стаметроўцы вольным стылем.

**5. Новым настаўнікам футбольнага клуба «Дынама-Мінск» стаў Душан Угрын-малодшы.** Пагадненне з чэшскім спецыялістам падпісана на год. Акрамя працы з чэшскімі клубамі, Угрын-малодшы трэніраваў румынскія «Цімішоара» і ЧФР, кіпрскі АЕЛ і тбіліскае «Дынама».

Адзначым, што Угрын-малодшы — сын Душана Угрына, и былога галоўнага трэнера нацыянальнай зборнай Чэхіі, якую ён прывёў у 1996 годзе да другога месца на чэмпіянаце Еўропы.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

**НАРОДЖАНЫЯ 22 снежня**

**Іх самая выдатная рыса — здольнасць да доўгатэрміновага планавання і рэалізацыі гэтых планаў. Тэма мернасці як у працы, так і ў сямейным жыцці вельмі актуальная для гэтых людзей. Больш за ўсё на свеце яны шануюць надзейнасць. Валодаюць устойлівым і сур'ёзным характарам. Лепшая супольнасць для іх — кампанія некалькіх блізкіх людзей або членаў сям'і. Вельмі важнай задачай для народжаных у гэты дзень з'яўляецца знаходжанне балансу паміж сур'ёзнасцю і гумарам, ізаляцыяй ад грамадства і сацыяльнай актыўнасцю.**

**НАРОДЖАНЫЯ 23 снежня**

**Гэта дзень нараджэння людзей, для якіх шчасце складаецца з засваення ўсяго новага. Разам з тым, яны асцярожныя і стрыманыя. Ім уласціва паважнае стаўленне да традыцыйных каштоўнасцяў. Народжаныя ў гэты дзень не пераносяць, калі іх не заўважаюць, і абсалютна не схільныя паддавацца ціску збоку. Характэрная для іх практычнасць і прыхільнасць да зямных інтарэсаў часта спалучаецца з упартасцю, што моцна абцяжарвае іншым зносіны з імі. Народжаныя ў гэты дзень цалкам здольныя выяўляць на дзіва цёплыя пачуцці, але настолькі ж натуральнымі для іх з'яўляюцца халоднасць і безуважлівасць у адносінах.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.27 | 16.50 | 7.23 |
| Віцебск — | 9.24 | 16.32 | 7.08 |
| Магілёў — | 9.17 | 16.40 | 7.23 |
| Гомель — | 9.05 | 16.45 | 7.40 |
| Гродна — | 9.41 | 17.07 | 7.26 |
| Брэст — | 9.33 | 17.16 | 7.43 |

**Месяц**

***Маладзік 22 снежня. Месяц у сузор'і Казярога.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандры, Таццяны, Анатоля, Івана, Канстанціна.* ***К.*** *Вікторыі, Івоны, Віктара, Славаміра, Яна.*



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

Інтэрнэт умацоўвае сям'ю. Схадзіць налева ўжо не тое каб не хочацца... Проста налева ўжо пайсці няма калі.

**— Мілы, што падарыць табе на Новы год?**
**— Жонку ў добрым настроі!**

Тры стадыі развіцця мужчыны:
1. «Агу» — немаўля.
2. «Ага» — падлетак.
3. «Угу» — муж.

**Прызыўнік у кабінеце акуліста. Доктар:**
**— Якую літару я паказваю?**
**— А вы дзе?**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.010. Індэкс 63850. Зак. № 5179.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 22 снежня 2014 года.